РАДЫЯ НОЧЫ:

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСЯХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

НАВІНЫ В. С. С. Р.

№ 105 (3213) Нядзеля, 12-га Мая 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

Працэс украінскіх сялян ў Львове

ВАРШАВА, 11. Учора ў Львове пачалася справа 46-ці украінскіх сялян вёскі Паб'яніца, Раскага павету. Гэта—эпілёг крывавай расправы паліцыі над удзельнікамі забастоўкі с.-г. рабочых у студзені г.г., калі 4 сялян было забіта і 8 цяжка паранена

Праезд т.т. Літвінава і Луначарскага

Учора праехалі праз Менск у Маскву варочаючыся з Жэнэвы старшыня дэлегацыі СССР на 6-й сэсіі падрыхтоўчай камісіі па разброеньні тав. Літвінаў і член дэлегацыі т. Луначарскі

IX ЗЬЕЗД САВЕТАЎ БССР

Даклад тав. М. ГАЛАДЗЕДА аб дзейнасьці ўраду БССР*)

II. Прамысловасьць

НЕ АДБУДОВА ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, А ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ

Пераходжу да вынікаў тэй працы ўраду, аб якой я раблю справаздачу перад вамі.

Напершае, павінен адзначыць галоўнае дасягненьне Савецкай Беларусі—гэта тое, што яна існуе ўжо 10 год. Чатыры месяцы назад мы сьвяткавалі 10-цігодзьдзе пралетарскай дыктатуры ў Савецкай Беларусі, у тэй Беларусі, якая была «окраиной царской империи». Гэта гістарычны факт вялізарнейшай важнасьці. Падругое, мы прайшлі ўжо так званы адбудоўчы пэрыяд.

Пэрыяд адбудоўчы на Беларусі мы можам характарызаваць, як пэрыяд пачатку сур'ёзнай і глыбокай сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Многіх з нашых старых прадпрыемстваў не пазнаць: з саматужных яны абярнуліся ў сапраўды індустрыяльныя. Для БССР гэта значыць, што яна ўжо стала **на шлях індустрыялізацыі.** Мы можам ужо з нашай тэрміналёгіі словы «адбудова прамысловасьці» па крысе пераносіць у абсяг гісторыі, а замест іх уводзіць словы **«індустрыялізацыя БССР»,** бо гэта адпавядае тэй сапраўднай сучаснасьці, у якой мы жывем. Вось некалькі лічбаў, якія характарызуюць нашу індустрыялізацыю за справаздачны пэрыяд.

Капітальныя ўкладаньні, напрыклад, у дзяржаўную цэнзавую прамысловасьць у 1927-28 г. складалі 170,9 проц. укладаньняў папярэдняга году, а ў 1928-29 г. складаюць 188,8 проц.

У 1926-27 г. гэтыя ўкладаньні складалі 13.146.000 р., у 1928-29 г.—42.419.000 руб.

Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці ў 1926-27 г. ацэньвалася ў 213.897.000 р., у 1928-29—у 364.849.000 руб.

УЗМАЦНЕНЬНЕ КІРУЮЧАЙ РОЛІ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

У выніку гэткіх наступальных працэсаў у разьвіцьці прамысловасьці мы маем значнае павялічэньне ролі прамысловасьці ў сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі БССР. Узмацненьне кіруючай ролі прамысловасьці відаць з лічбаў, якія паказваюць павялічэньне ўдзельнае вагі прадукцыі прамысловасьці ў суадносінах да прадукцыі сельскай гаспадаркі. Прычым гэта праходзіла на фоне ўзросту валавой прадукцыі і сельскай гаспадаркі.

Вось дынаміка ўдзельнае вагі прадукцыі прамысловасьці. У нярухомых цэнах 1926-27 г. без лесаводзтва, рыбаўства і паляваньня сельская гаспадарка складала ў 1927-28 г. 75,5, у 1927-28 г.—72,3, у 1928-29 г.—68,4; прамысловасьць (уся) у 1926-27 г.—24,5, у 1927-28 г.—27,7, у 1928-29 г.—31,6.

Разам з пашырэньнем прамысловасьці мы наглядаем значны рост пралетарскіх кадраў, што для БССР, як дробна-сялянскай краіны, асабліва важна. Вось лічбы, якія гэта пацьвярджаюць. Агульны лік рабочых у тысячах чалавек ва ўсёй прамысловасьці складаў: у 1926-27 г.—55,8, у 1927-28 г.—57,8, у 1928-29 г.—68,6 (103,5 проц., 118,6 проц. і 122,9 проц. у адносінах да папярэдняга году); у тым ліку адпаведна ў буйной (цэнзавай прамысловасьці)—39,6, 43,3 і 56,0 (109,3 проц., 129,3 проц. і 141,4 проц.) і ў дробнай—16,2 14,5 і 12,6 (89,5 проц., 86,8 проц. і 77,8 проц.).

Матар'яльнае становішча рабочае клясы БССР за гэтыя гады значна палепшылася. Сярэдняя зарплата рабочага вырасла па ўсёй дзяржаўнай і цэнзавай прамысловасьці на 19,3 проц., а па прамысловасьці ВСНГ—на 24,7 проц.

На падставе гэтых кароткіх лічбаў можна, не хвалячыся, сказаць, што ўрад БССР галоўныя дырэктывы VIII-га зьезду саветаў па ўзмацненьні ролі прамысловасьці ў народнай гаспадарцы ў асноўным выканаў. Далей трэба адзначыць, што **мы сталі ўжо на вышэйшую ступень эканамічнага разьвіцьця БССР, на ступеньку сапраўднай індустрыялізацыі.**

ПАШЫРЭНЬНЕ БАЗЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Раней мы гаварылі аб прамысловым будаўніцтве, арыентуючыся толькі на мясцовым сырцы і, галоўным чынам, на сельска-гаспадарчым сырцы (больш усяго на лініі разгортваньня харчовай і лясной прамысловасьці). За справаздачны пэрыяд нам удалося дабіцца спачатку пастановы ВСНГ СССР, а потым і пастановы Ўраду Саюзу ССР аб тым, што пэрспэктывы прамысловага будаўніцтва ў БССР могуць і павінны арыентавацца ня толькі на мясцовым сырцы, але і на прывозным сырцы і на завозным паўфабрыкаты. Гэта значыць, што ідзе справа аб рэальным пашырэньні базы індустрыялізацыі БССР, што канкрэтна ўжо адбілася ў тэй пяцігодцы, якую зьезд будзе зацьвярджаць.

Мы раней часта спрачаліся аб тым, якога тыпу прамысловасьць нам трэба будаваць. Зараз гэтыя спрэчкі цалкам вычарпаны і адышлі ў абсяг гісторыі. У нас пачала ужо працаваць і ў далейшым будзе шпарка разгортвацца мэталяапрацоўчая прамысловасьць (сельска-гаспадарчае сярэдняе машынабудаўніцтва і варштата-будаўніцтва). Гэта **ні ў якім разе не азначае,** што задача **далейшай** арганізацыі і пашырэньня **ўласнай** мясцова-сырцовай базы павінна адыйсьці на задні плян. Наадварот пашырэньне прамысловага будаўніцтва патрабуе ад нас самаахвярнай працы па пашырэньні мясцовай сырцовай базы, у першую чаргу сельска-гаспадарчага сырцу праз рашучы ўздым сельскай гаспадаркі. Гэта ўсё азначае, паўтараю, што працоўныя БССР ужо фактычна і рэальна ўзышлі на сапраўдную ступеньку індустрыялізацыі.

III. Сельская гаспадарка

РАЗЬВІЦЬЦЁ ПРАЦЭСАЎ АГРАМАДЖАНЬНЯ

Асноўным пачаткам у працы ўраду па ўзьняцьці сельскай гаспадаркі была нясупынная лінія на ўзмацненьні аграмаджаных працэсаў у ёй, гэта зн. лінія на калектывізацыю. Вынікам гэтага зьявілася тое, што толькі за апошні год па БССР арганізавалася 554 калектывы—на 125 проц. больш, чым за ўвесь час нашай работы ў гэтай галіне.

Гэтаму, зразумела, спрыяла наша агульная палітыка, палітыка нашай партыі і савецкай улады, палітыка матар'яльнага і маральнага падтрыманьня тых працэсаў калектывізацыі, якія ясна вызначыліся ў сельскай гаспадарцы. Гэтаму спрыяла і тое, што мы маем значнае разьвіцьцё калектыўнага руху сярод асноўнай масы сялянства.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА БЯЗУПЫННА РАСЬЦЕ

Павялічэньне ўкладаньняў сродкаў у сельскую гаспадарку за гэтыя гады характарызуецца наступнымі лічбамі.

Усяго ўкладаньняў у сельскую гаспадарку было зроблена (па бюджэце і крэдыце) у 1000 рублёх: у 1926-27 г. 137.348, у 1927-28 г.—132.666, у 1928-29 г.—148.582 (96,6 проц. і 112,0 проц. у адносінах да папярэдняга году).

А вось вынікі па пашырэньні пасеўнай плошчы. Рост усёй пасеўнай плошчы, калі прыняць 1926-27 г. за 100%, вызначаецца: у 1927-28 г. у 102,5 пр., у 1928-29 г. у 103,3 проц.; у тым ліку адпаведна: пад харчовыя культуры—101,1 і 105,0; пад кармовыя культуры—99,1 і 90,9; пад тэхнічныя—111,8 і 112,0; пад бульбу—106,7 і 109,3 і пад сеяныя травы—132,6 і 136,1.

Агульны процант пасеўнай плошчы павялічыўся на 3,3 проц., але характэрна значная перасоўка ў паасобных культурах у бок павялічэньня тэхнічных і сеяных траў.

Чаго-ж мы дабіліся ў павышэньні ўраджайнасьці за справаздачны пэрыяд?

Ураджай складаў па ўсіх збожжавых у 1926-27 г. 5,73 цэнтнэраў (100,0 проц.), у 1927-28 г.—5,96 ц. (104,0 пр.), у 1928-29 г.—6,69 ц. (116,8 пр.); адпаведна: па ільняным семі—2,59 ц. (100,0 пр.), 3,36 ц. (129,7 пр.), 3,17 ц. (122,4 пр.); па ільну-валакне—1,90 ц. (100,0 пр.), 1,99 ц. (104,7 пр.), 2,49 ц. (131,1 пр).

Ці можна задаволіцца 5,96 цэнт. гэктар. збожжавых культур? Ніяк нельга. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі значна вырасла, але яшчэ недастаткова.

За апошнія часы вы ня раз чулі ад правых ухіленістаў у нашай партыі такія слоўцы, як «дэградацыя» сельскай гаспадаркі. Хіба прыведзеныя лічбы гавораць аб якой-небудзь «дэградацыі» сельскай гаспадаркі. Ні ў якім разе! З іх можна толькі бачыць тое, што сельская гаспадарка адстае ў сваім росьце ад прамысловасьці, але расьце бязупынна.

Па многіх галінах разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры, Савецкая Беларусь расьце значна большым тэмпам, чым сярэдні тэмп росту Саюзу ССР.

IV. Культурнае будаўніцтва

НА ВЫШЭЙШУЮ КУЛЬТУРНУЮ СТУПЕНЬ

У галіне культурнага будаўніцтва мы таксама перайшлі на вышэйшую ступень. Вось паказальнікі гэтага. Не так даўно мы рэарганізавалі Інстытут Беларускай Культуры ў Беларускую Акадэмію Навук.

Навукова-дасьледчая праца разгарнулася ў шырокіх маштабах. Гэта нам часткова ўжо дапамагае, а ў далейшым павінна яшчэ больш дапамагчы вышукваць і мабілізаваць нашы энэргетычныя, прыродныя і матар'яльныя рэсурсы, якія трэба паставіць на службу індустрыялізацыі. Мы рэарганізавалі Інстытут Беларускай Культуры ў Акадэмію Навук, мы пашырылі значна работу Навукова-Дасьледчага інстытуту па сельскай і лясной гаспадарцы, мы пачалі ўжо арганізацыю навукова-дасьледчага інстытуту па прамысловасьці.

Па ахопе дзяцей школамі мы ідзем на дрэнна, нават вышэй сярэднягa процанту ў Саюзе. Школы бязупынна растуць. Пашыраецца і ўзмацняецца сетка спэцыяльных тэхнікумаў па падрыхтоўцы сярэднята камандняга складу.

У нас пашыраюцца кадры пралетарскіх пісьменьнікаў, прычым, пісьменьнікі гэтыя ўсё больш і больш ідэалёгічна крышталізуюцца з пункту погляду пралетарскай вытрыманасьці.

У 1926-27 г. было выдана нашым Беларыжвыдавецтвам 7 млн аркушоў усялякай літаратуры і ўсякіх твораў; у 1928-29 г. будзе выдана 25 млн. аркушоў.

Па нацыянальных адзнаках наша выдавецкая дзейнасьць, якая забясьпечвае матар'яльную падставу для разьвіцьця літаратурнай, мастацкай і культурнай дзейнасьці нашае рэспублікі, разьмяркоўваецца такім чынам: беларускай літаратуры ў 1926-27 г. было выдана 6 млн. аркушоў, у 1928-29 г.—23,5 млн. Літаратуры іншых нацыянальнасьцяй на адпаведных падох выдана: яўрэйскай літаратуры—440.000 і 1 млн., польскай—320.000 і 450000. Па ўсіх галінах нацыянальнай культуры мы ідзем гіганцкімі крокамі ўперад, пашыраем матар'яльную падставу для разьвіцьця літаратуры, культуры і мастацтва усіх нацыянальнасьцяй, але найбольш шпаркі і вялікі рост—гэта рост беларускіх выданьняў.

Шпарка разгортваецца дзейнасьць нашай мастацкай творчасьці. Нашы тэатры бязупынна растуць. Яны ўжо ў асноўным аўладалі шырокай масай рабочага глядача. Яны ўжо даюць у асноўным добрую прадукцыю. Як з боку мастацкага, так і з боку ідэалёгічнага ўзмацняюцца і крышталізуюцца і ўсё ўсё больш і больш паглыбляюць сваю дзейнасьць. Гэта значыць, што і ў разьвіцьці культуры, ва ўсім культурным сэктары разам узятым, мы сталі **на вышэйшую ступень.** Гэта значыць, што мы падрыхтоўчы курс ужо прайшлі, г. зн. што **мы вытрымалі экзамэн і перайшлі ў вышэйшую клясу—у Акадэмію Навук.**

Чаму мы маем такі гаспадарчы і культурны рост?

Галоўнае таму, што мы жывем у песным саюзе з усімі народамі СССР і зьяўляемся часткаю вялікага і магутнага Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Саюз ССР сыстэматычна дапамагае нам вялізарнымі сродкамі. Саюзны ўрад даў дырэктывы саюзным установам, каб матар'яльную дапамогу Савецкай Беларусі яшчэ больш пашырыць. У зьвязку з гэтым у нас адкрыліся вялікія пэрспэктывы сацыялістычнага будаўніцтва.

РОСТ БЮДЖЭТУ

У выніку гэтага мы ўжо рэальна маем наступнае: наш бюджэт як дзяржаўны, так і мясцовы сёлета вырас да рэкордных разьмераў. Вось з гэтых лічбаў можна ў гэтым упэўніцца:

Рост бюджэту за апошнія гады характарызуеца наступнымі лічбамі:

Зводны бюджэт у млн. руб. складаў у 1926-27 г.—71.4, у 1927-28 г.—81,6, у 1928-29 г.—114,9 (114.2 і 140.8—проц да папярэдняга году); адпаведна—дзяржбюджэт—52.4, 62.0 і 97.3 (118.3 і 156.9 проц.); мясцовы бюджэт— 38,7, 43.5 і 56.7 (112.4 і 130.3 проц.).

Гэта нячуваны рост фінансавай матар'яльнай базы, якая гарантуе наш рух уперад.

Такія вынікі мы маем яшчэ таму, што рабочыя і сялянскія масы Савецкай Беларусі праявілі максымум энэргіі на працоўным фронце. Мы яшчэ больш узмацнілі за гэты час саюз рабочае клясы з асноўнай масай сялянства, прычым саюз гэты ўзмацняем **на новай вытворчай базе.**

Нашы дасягненьні ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, яскрава сьведчаць аб тым, што палітыка нашае камуністычнае партыі і савецкае ўлады, палітыка Леніна дае сур'ёзныя станоўчыя вынікі.

V. Пытаньні нацпалітыкі

Асноўным паказчыкам і асноўнай умовай росту нацыянальнага адраджэньня БССР зьяўляюцца нашы посьпехі па адбудове народнае гаспадаркі. Рост нацыянальнай культуры нельга вымяраць толькі ростам чыста культурнай працы. У першую чаргу нацпалітыка і яе ажыцьцяўленьне павінна вымярацца ростам эканомікі, вытворчасьці нашае краіны, г. зн. ростам матар'яльнай асновы. Таму ўсе тыя дасягненьні, аб якіх я гаварыў, і ёсьць дасягненьні ў нацыянальнай палітыцы нашага ўраду.

Калі ўзяць пытаньне беларусізацыі, як пытаньне, над якім мы павінны працаваць штодзенна і напружана, то і тут мы маем значныя посьпехі. Беларусізаваны, напрыклад, амаль усе ўстановы на ўсе 100 проц. Праўда, частка гаспадарчых і каапэрацыйных устаноў яшчэ ня зусім беларусізаваны і транспарт.

Але калі вы возьмеце нашы савецкія ўстановы, якія маюць непасрэднае дачыненьне да шырокіх мас працоўных Беларусі, дык яны цалкам, на 100 проц. беларусізаваны. Мы можам з задаваленьнем адзначыць такі факт, як рост шырокіх кадраў беларускіх працаўнікоў, пачынаючы зьнізу да верху, у савецкіх, грамадзкіх і партыйных арганізацыях.

Мы таксама бачым, што беларуская мова ўваходзіць рэальна ў жыцьцё, у быт, яна ахапляе шырокія колы рабочых.

Рабочая кляса ў асноўным становіцца ўжо сапраўдным уладаром, правадніком і кіраўніком усіх працэсаў разьвіцьця нацыянальнай культуры, у тым ліку і беларусізацыі.

РАШУЧАЯ БАРАЦЬБА З НЯДБАЙНЫМІ АДНОСІНАМІ ДА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

Мы ўжо маем посьпехі ў барацьбе з русіфікатарскімі тэндэнцыямі старога чыноўніцтва. Вядома, што засталіся яшчэ людзі з гэтага старога чыноўніцтва, русіфікатарская чыноўніцтва, якое яшчэ і да гэтага часу з халадком адносіцца да ўкараненьня ў жыцьцё, у быт беларускай мовы і культуры.

Пералічыўшы ў асноўным гэтыя дасягненьні, мы павінны зазначыць на вызьдзе саветаў зусім яскрава, што ў нас у галіне беларусізацыі ёсьць яшчэ шмат недаробленага, ёсьць яшчэ рад выпадкаў, калі адносяцца да беларусізацыі так сабе, з халадком, часта і з вышыні.

Гэта характарыстыка датычыць у большай сваёй частцы працаўнікоў цэнтральных і акруговых устаноў. З гэтым зьявішчам нам трэба весьці рашучую барацьбу. Трэба навучыць шанаваць беларускую мову тых людзей, якія яшчэ «з высоку» адносяцца да яе. Трэба весьці барацьбу самым рашучым чынам, як можа наогул пралетарыят весьці барацьбу на любым фронце будаўніцтва сацыялізму, а гэта ёсьць адна з найбольш важных пазыцый нашага сацыялістычнага фронту.

ПОСЬПЕХІ Ў АБСЛУГОЎВАНЬНІ НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ

У галіне абслугоўваньня нацменшасьцяй мы таксама маем значныя посьпехі. Савецкая ўлада Беларусі змагла выканаць вялікую працу па пераводзе яўрэйскага працоўнага насельніцтва на вытворчую працу, у першую чаргу на працу ў сельскай гаспадарцы. За гэты час мы перадалі пад яўрэйскае зямляробства 59½ тыс. гкт зямлі, і ўпарадкавалі на гэтай зямлі больш 9 тыс. сем'яў.

Дзе вы бачылі, каб той народ, для якога была адмежавана лінія аселасьці, які быў выбіт з каляіны царскім урадам, каб ён так хутка і так пасьлядоўна пераходзіў на вытворчыя працэсы і рабіўся-б працоўным грамадзянінам?

Такіх прыкладаў у гісторыі няма. Гэта ёсьць толькі ў дзяржаве пралетарскай дыктатуры. Гэтымі посьпехамі мы можам ганарыцца ня толькі на ўвесь Саюз, але на ўвесь сьвет. Пра рабінаў капіталістыя адурманьваюць яўрэйскі народ і далей гутарак ня ідуць, а тут мы рэальна ставім на вытворчыя рэйкі асноўную масу працоўнага яўрэйскага насельніцтва. Ня так даўно СНК БССР пастанавіў пачаць гаспадарчае ўпарадкаваньне яшчэ 8 мястэчак да тых 8, якія пачалі ўпарадкоўваць у мінулым годзе. Мы многа зрабілі і для ўздыму эканомікі і культуры для працоўных палякаў. Шмат школ расьце на іх роднай мове, растуць нацыянальныя саветы і г. д.

ДЗЕЙНАСЬЦЬ ФАШЫСТЫХ І ІХ ЛЁКАЯЎ

Вы ня знойдзеце ніводнай газэты, скажам, у нашай суседзі Польшчы, якая заўсёды не страка ціла-б яўнымі выдумкамі, яўнай хлусьнёй на працоўных Савецкай Беларусі па нацыянальным пытаньні. Вось, напрыклад, што піша «Дзеньнік Віленскі» (у сакавіку м-цы):

«Беларуская мова паступова скасоўваецца ва ўстановах, уся карэспандэнцыя вядзецца на расійскай мове, таксама вельмі дрэнна абстаіць у школах са справай увядзеньня беларускай мовы. Ва ўсіх клясах сярэдніх і ніжэйшых школ зноў уведзена расійская мова.

Нацыянальныя беларускія арганізацыі заклікаюць у адозвах не дапусьціць да русыфікацыі беларускіх устаноў і школ».

Той, хто мае толькі маленькае дачыненьне да практычнага жыцьця нашых школ, нашых устаноў і ўсёй нашай працы, для таго няма ніякага сумненьня ў тым, што гэта хлусьня, выдумка. Але гэтыя хлусьні ім патрэбны, каб апраўдаць дзейнасьць фашысцкай дэфэнзывы і ўраду на разгроме нацыянальных беларускіх арганізацый, для ашуканьня беларускага народу Заходняй Беларусі, які змагаецца толькі за свае элемэнтарныя правы, за правы гаварыць на сваёй роднай мове, на якой улада забараніла вучыць сваіх дзяцей у школах, якія зачыняе фашысцкі ўрад.

Досыць напомніць тое, што беларуская гімназія ў Радашковічах зачынена. Досыць успомніць, што шмат устаноў і беларускіх школ, якія існавалі, хоць на адзінках, зачыняюцца. Вучні гэтых школ арыштоўваюцца рукамі прадажных лёкаяў, выхадцаў з беларускай буржуазіі. Нашаму клясаваму ворагу, фашысцкай буржуазіі патрэбна хлусьня для ашуканьня працоўных Заходняй Беларусі для таго, каб прыкрыць сваю злачынную дзейнасьць у адносінах да беларускага народу, які да гэтай пары жыве ў Заходняй Беларусі пад уціскам фашысцкага бота.

Для таго, каб ашукаць працоўных Заходняй Беларусі, польская дэфэнзыва дазваляе сваім лёкаям, якія прадаюцца дэфэнзыве, выдаваць на беларускай мове газэты. Але гэтыя газэты цалкам служаць фашысцкай буржуазіі. І вось, напрыклад, фашысцкая газэта «Грамадзянін», якая выходзіла на беларускай мове (баюся, што яна будзе зачынена за гэты артыкул, хоць ён наскрозь фашысцкі), піша наступнае:

«Паперныя, бальшавікі ставяць у аснову сваёй праграмы не нацыянальнае, а клясавае пытаньне, Дзеля гэтага нават выкрэслілі з геаграфіі назву «Расія», пакінуўшы аднак-жа назвы «Савецкае Беларусі і Савецкае Украіны.

Падругое, мы да гэтай пары наогул упікалі ставіць у прыклад Польшчы адносіны Маскоўскіх дыктатараў да ўсходняй Беларусі і Украіны, гэта было-б абразай для кожнай культурнай нацыі».

Такім чынам, зачыненьне беларускіх адзіночных школ, якія існавалі ў Заходняй Беларусі, арышты студэнтва, тых, што садзяць на лаўку падсудных сотні і тысячы працоўнага народу (напрыклад, суд над Грамадой)—гэта для іх не абраза, а вось рост, умацаваньне, разьвіцьцё нацыянальнай культуры хуткім тэмпам—гэта для іх зьяўляецца абразаю.

Так, мы можам ім сказаць: бальшавікі ставяць галоўным клясавае пытаньне—гэта правільна і верна. І іменна таму, што мы над клясавай сутнасьцю працуем у першую чаргу ва ўсёй нашай нацыянальнай палітыцы, мы маем такія посьпехі ў разьвіцьці нацпалітыкі. Вось у гэтым і розьніца нашай нацыянальнай палітыкі ад нацыянальнай палітыкі буржуазных дзяржаў усяго капіталістычнага сьвету.

Вось што піша гэта газэта дзеля таго, каб усё-такі мець некаторы аўтарытэт у беларускіх масах Заходняй Беларусі:

«Але калі нас выклікаюць на шчырасьць (трэба лічыць, што яны адказваюць якой-небудзь польскай газэце), то прыдзецца ўсё такі канстатаваць, што ва Ўсходняй Беларусі дзяржаўнай мовай усё-ж такі прызнана беларуская і гэта праводзіцца ў жыцьцё: там ёсьць Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, Беларускі Дзяржаўны Тэатр, Навуковая Беларуская Акадэмія, усе дзяржаўныя беларускія сярэднія і першапачатковыя школы і г. д. і гэта не задавальне беларусоў, якія вядуць няўпынную, аружную барацьбу са сваімі прыгнётчыкамі».

Значыць ня прызнаць фактаў нельга і прызнаць таксама нельга. Гэта значыць ёсьць і тое і другое. Хочацца, ня хочацца прадажным «палітыкам» з «Грамадзяніна», а факты прызнаць прыходзіцца. І здраднікам беларускага народу факты б'юць у вочы.

Зьвернемся да ацэнкі зусім не камуністага і нават не савецкага грамадзяніна, карэспандэнта нямецкай газэты ў Бэрліне «Фосішэ Цэйтунг» Вільма Штэйн, які быў у Беларусі ня так даўно, агледзеў усё нашае жыцьцё і ў першую чаргу аддаваў належную ўвагу нацыянальнаму пытаньню. Ён у сваім артыкуле, які зьмешчан у газэце «Фосішэ Цэйтунг», піша наступнае:

«Беларусы жылі, як рабы, над уладай польскіх абшарнікаў і расійскіх чыноўнікаў... Беларускі нацыянальны рух, «беларусізацыя» беларусаў, якая сёньня паразьліва магутна і жыцьцёва, у асноўным зьяўляецца плодам бальшавіцкай рэвалюцыі. Савецкая сыстэма,—панаваньне пралетарыяту і нацыянальнае самаўсьведамленьне тут відавочна сынонімы. Беларусізацыя, якая праводзіцца Савецкай уладай сыстэматычна, хуткім тэмпам, адказвае высокім ідэалам самавызначэньня народаў і ў той-жа час зьяўляецца вельмі важным фактарам унутранай і замежнай палітыкі. Беларускі нацыяналізм не забывае, што ён нарадзіўся пад савецкай зьвяздой і што толькі пад ёй ён можа мець сваё разьвіцьцё.

... Беларусь зьяўляецца дэфіцытнай старонкай, і толькі ў саюзе з Масквой яна стала ўпяршыню старонкай, якая рухаецца амаль бязупынна ўперад. Мысьлі аб арыентацыі на Захад, аб гэтым часамі можна прачытаць у польскіх газэтах, маюцца ў Беларусі, ня мала адгалоскаў іх можна знайсьці яшчэ ў легэндарна фантастычных думках асобных людзей, якія сваё леталічэньне вядуць і мэлёдыяй сваёй душы робяць не Кастрычнікавую рэвалюцыю, а стварэньне «Беларускай Рэспублікі» (гутарка ідзе аб Беларускай Народнай Рэспубліцы).

Вось ацэнка нацыятыньняў у нас, угрунтаваная на фактах, ацэнка прадстаўніка буржуазнай нямецкай прэсы.

У далейшай частцы гэтага артыкулу ён піша:

«Слаўнай старонкай савецкага ладу зьяўляецца яго дасягненьні ў культурнай справе, якая праводзіцца ўсяго толькі некалькі гадоў (толькі ў 1920 г. скончылася польская акупацыя). Адным з найбольш моцных, утваральных ураджаньне, культурных дасягненьняў зьяўляецца Менская Дзяржаўная Бібліятэка, якая пад мудрым кіраўніцтвам у працягу 7 гадоў, амаль зусім ня маючы ніякіх ранейшых бібліятэк у выглядзе базы, узрасла да 4 млн. томаў, мае поўны збор матар'ялаў па беларускім пытаньні і сёньня знаходзіцца ў ажыцьцёўленых зносінах з замежнымі унівэрсытэтамі і бібліятэкамі, асабліва Нямеччыны. Яна мае 300 нямецкіх навуковых журналаў. Што стварылася з няпісьменным, загнаным беларусам? Перад чытальнымі залямі дзяржаўнай бібліятэкі я бачыў рабочых студэнтаў, старых і маладых людзей, якія стаялі ў чарзе для таго, каб атрымаць першае выпаленае месца. А ў гэтых залях выдаецца толькі навуковая літаратура. Масква можа ганарыцца в поўным правам, што яна разбудзіла чалавека і адчыніла яму шлях да культуры і асьветы».

Людзі, якія ня бачылі ўсіх этапаў працы Савецкай улады, якія бачылі толькі раней жыцьцё «загнанага беларуса», яны дзівяцца тым гіганцкім дасягненьням, якіх дабілася БССР, ня гледзячы на тое, што яны не зьяўляюцца прыхільнікамі Савецкае ўлады.

VI. Пэрспэктывы нашага будаўніцтва

АД МАЛЯРЫЙНЫХ БАЛОТ ДА ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ

Пяцігадовы плян адкрывае перад намі шырачэзныя кругавіны нашых магчымасьцяй па сацыялістычнай рэканструкцыі нашай народнай гаспадаркі. Калі мы падыходзім канкрэтна да вызначэньня матар'яльных падстаў нашага будаўніцтва, мы ў першую чаргу упіраемся ў пытаньне энэргетычнай базы, якая зьяўляецца адным з асноўных фактараў, які павінен падвесьці моцны грунт пад нашае сацыялістычнае будаўніцтва.

Праблема энэргетыкі пакуль што вырашаецца ў нас праз праблему скарыстаньня торфу. Торф у нас зьяўляецца асноўным фактарам, які, ператвараючыся ў электраэнэргію, падымае на вышэйшую ступень тэхніку і энэргетычную базу ва ўсёй нашай гаспадарцы. **Мы ў гэтай пяцігодцы ставім нашы балоты на службу індустрыялізацыі БССР у вялікіх маштабах—ад малярыйных балот да электрафікацыі Беларусі—вось курс нашай праграмы разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва на бліжэйшыя гады.**

Мы распрацоўку торфу думаем давесьці для патрэб народнай гаспадаркі гарадоў і прамысловасьці да 955 тыс. тон у апошні год пяцігодкі і для патрэб насельніцтва—да 750 тыс. тон. Гэта колькасныя аб'ёмы распрацоўкі торфу. І на падставе гэтага мы праектуем вялікі крок уперад па шляху электрыфікацыі. У гэтай пяцігодцы вы знойдзеце новую моцную раённую электрастанцыю. Вы ведаеце, што па дакладу нашага ўраду ў кастрычніку 1928 году СНК Саюзу была дана дырэктыва аб тым, каб Дзяржплян Саюзу запрактаваў новую раённую электрастанцыю. І вось гэтая дырэктыва ёсьць ужо рэальнасьць: такая электрастанцыя ўжо ўключана Дзяржпляном Саюзу, і Саюзны ўрад зацьвердзіў гэтае праектаваньне. Так што мы разам са сканчэньнем Асінбуду, гэтага магутнага фактара ператварэньня нашай гаспадаркі на новую тэхнічную базу, будзем будаваць такую-ж моцную раённую станцыю ў раёне Палесься, у раёне Гомельшчыны. І на падставе гэтага мы маем такі выгляд вырабу электраэнэргіі: мы павялічваем магутнасьць усіх электрастанцый в 14.004 клв. да 107.000 клв., а выраб электраэнэргіі павялічваем з 37 млн. клв.-гадзін да 250 клв.-гадзін у канцы пяцігодкі Гэта вялізарны скачок наперад.

Скарыстаньне торфу дасьць магчымасьць таксама прыстасаваць лес, як асноўную базу сырцу нашай дрэвапрацоўчай прамысловасьці.

АД БЕЛАРУСІ АГРАРНАЙ ДА БЕЛАРУСІ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ

Мы вызначаем, што капітальныя ўкладаньні, як я ўжо паказаў, праектуюцца на ўсёй, у тым ліку мясцовай і каапэрацыйнай прамысловасьці ў 306.900.000 рублёў, а па адной прамысловасьці ВСНГ—231 млн. руб., замест 96 млн., якія праектаваліся ў першым варыянце. Валавая прадукцыя вырасьце да 663 млн. руб. у год. Калі паглядзець, якую ролю будзе займаць індустрыя ў адносінах да ўсёй народнай гаспадаркі, дык тут мы маем такія лічбы, што ўдзельная вага прадукцыі прамысловасьці павялічваецца (па ўсёй прамысловасьці) з 27.7 проц., якія яна займае цяпер, да 44,7 проц. Гэта, таварышы, гаворыць **ужо аб тым, што Беларусь аграрная стане Беларусьсю індустрыяльна-аграрнай.** Гэта значыць тое, аб чым некалькі гадоў таму назад шмат хто з нас і марыць ня мог.

Рост рабочых кадраў таксама будзе вялікі. Колькасьць рабочых вырасьце на 134%, ці на 52.800 чал. Мы праектуем павялічыць рост рэальнай зарплаты ня менш, чым на 50 проц.

Гэтыя лічбы, якія я надаў ужо, сьведчаць аб тым, якія шырокія пэрспэктывы адчыняюцца на шляху індустрыялізацыі Савецкай Беларусі.

Варта напомніць, акрамя дзьвёх вялікіх электрастанцый яшчэ такія прадпрыемствы, як фабрыка штучнага шоўку, завод сельгасмашын і прылад у Гомелі, ільна-прадзільна-ткацкія камбінаты і інш., каб убачыць, што Беларусь лапцюжная (як гаварыў у сваёй паэме Чарот) **ператвараецца ў Беларусь індустрыяльную.**

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ—АСНОЎНЫ ШЛЯХ ЯЕ ЎЗДЫМУ

Мы павінны паставіць перад сабой, перад усімі рабочымі і сялянамі ад імя зьезду саветаў Беларусі так пытаньне, **што толькі на базе індустрыялізацыі, ня на падставе разьвіцьця сельскай гаспадаркі,** можна гаварыць і ажыцьцяўляць задачы ўздыму сельскай гаспадаркі і яе сацыялістычнай рэканструкцыі. Вяз гэткай устаноўкі зусім памылкова думаць, што мы можам сур'ёзна падняць прадукцыйнасьць сельскай гаспадаркі. Роля індустрыі ў адносінах да сельскай гаспадаркі—гэта ёсьць роля вядучая, гэта ёсьць той вытворча-індустрыяльны падважнік, якім пацягнецца па шляху ўздыму сельская гаспадарка. Асноўная задача, якая ва ўвесь свой рост стаіць перад намі на бліжэйшыя пяць год, гэта задача сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на базе калектывізацыі, вытворчага каапэраваньня, а таксама праз будаўніцтва саўгасаў і праз індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі—гэта асноўны шлях яе ўздыму.

Наша партыя і савецкая ўлада ўсе гэтыя гады з часу існаваньня савецкай улады сур'ёзна займаліся прапагандаю ідэй калектывізацыі сярод шырокіх колаў сялянства, растлумачваючы значэньне гэтай важнейшай гістарычнай работы, на справе паказвала прыклады—якую выгаду сялянству дае аграмаджаньне працэсаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

Зараз, таварышы, мы можам ужо, не памыляючыся, сказаць, што мы ўвайшлі ў такую паласу, калі шырокія пласты бяднацка-сераднацкага сялянства ўжо пераканаліся, зразумелі нашую палітыку калектывізацыі. Дзякуючы гэтаму глыбокаму перакананьню, мы і бачым вялізны калгасны рух сярод сялянства.

Наша задача скарыстаць гэты фактар, аўладаць калгасным рухам, далей пашырыць і замацо

Ангельска-амэрыканскае супэрніцтва і рэпарацыі

Новая прапанова амэрыканскага экспэрта на парыскай рэпарацыйнай канфэрэнцыі зьблізіла пункты погляду Нямеччыны і Францыі, але сустрэла вельмі моцнае супраціўленьне з боку Англіі. Згодна новаму пляну, Нямеччына плаціць у працягу 37 год у сярэднім на 1.988 млн. марак у год (супроць 2.500 млн. у 1929-30 г. згодна пляну Даўэса). Акрамя таго, калі скончыцца гэты тэрмін, яна павінна плаціць яшчэ 21 год па 1.700 млн. марак. Але гэтыя апошнія будуць пакрыты за кошт прыбыткаў будучага рэпарацыйнага звыш-банку. Уся сума рэпарацый паводле новага праекту складае пры пераводзе на цэнасьць сёняшняга дня 36 мільярдаў, з якіх 10 мільярдаў марак па пакрыцьцё выдаткаў саюзнікаў па рэпарацыях (г. зн. на аднаўленьне ваенных разбурэньняў) павінны быць зараз мабілізаваны. Іменна вакол разьмеркаваньня гэтых сум узьніклі спрэчкі.

Па згодзе ў ЗША ў 1920 годзе ўласна-рэпарацыйныя плацяжы Нямеччыны разьмяркоўваюцца наступным чынам: Францыя—52 проц., Англія—22 проц., Італія—10 проц., Бэльгія—8 проц., іншыя краіны—Польшча, Юго-Славія і г. д.—рэшту ў 2 проц. Новы плян Юнга, які ў асноўным прыняты Нямеччынай, зьніжае частку Англіі з 22 проц. да 18 проц. Гэта выклікала вялізнае неадавальненьне ў Англіі. Ангельскі буржуазны друк бяз розьніцы адценьняў даволі рэзка крытыкуе Юнга і яго шчодрасьць за кошт ангельскі.

Кансэрватыўная «Морнінг Пост» піша: няхай ПАЗШ пакажуць прыклад і пойдуць на такія ўступкі, якія яны прапануюць нам». Ангельскі міністр фінансаў Чэрчыль лічыў патрэбным выступіць з рашучай заявай аб тым, што плян Юнга зусім няўжытны для Англіі. Здарыўся, такім чынам, формены скандал: у той час, як пункты погляду Нямеччыны і большасьці саюзьнікаў зьблізіліся, выкрылася глыбокае разыходжаньне ў лягеры саміх саюзьнікаў, паміж Англіяй і ПАЗШ. «Сапраўды,—як кажа «Таймс»—мізэрнае... відовішча, якое сьведчыць аб бясьсільлі».

Усё гэта зьяўляецца вельмі характэрным для агульнага становішча англа-амэрыканскага антаганізму. Калі выпрацоўваўся плян Даўэса, амэрыканскія і ангельскія фінансісты, здавалася, дружна супрацоўнічалі. Але практыка паказала, што ўкараненьне амэрыканскага капіталу ў Эўропе ў зьвязку з «даўэсізацыяй» Нямеччыны пашырыла разрэз поглядаў паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам. Магчыма, аднак, што спрэчкі гэтыя будуць уладжаны і канфэрэнцыя прыйдзе да згоды. Нямеччына павінна будзе плаціць у працягу 37 год вельмі вялікія сумы. Нямецкая буржуазія разам з сацыял-дэмакратыяй, зразумела зробіць усё магчымае, каб усклясьці цяжар гэтых плацяжоў на плечы пралетарыяту. Але пралетары, які ідзе на барыкады,—ня той аб'ект для бязьмежнай эксплёатацыі, які патрэбен сусьветным ліхварам. Ён можа «нечакана» абвергнуць іх разьлікі.

(«Правда»).

Барацьба за рэвалюцыйны рабочы ўрад—

вось асноўны лёзунг прадвыбарчай праграмы кампартыі Англіі

ЛЁНДАН, 10. Ангельская кампартыя апублікавала прадвыбарчую адозву, у якой заяўляе, што кансэрватыўная, лібэральная і рабочая партыі абараняюць дыктатуру капіталу, якая ажыцьцяўляецца пад прыкрыцьцём так званай парламэнцкай дэмакратыі. Кампартыя змагаецца за дыктатуру рабочае клясы. Асноўны лёзунг прадвыбарчай праграмы камуністычнай партыі гэта—барацьба за рэвалюцыйны рабочы ўрад, які павінен нацыяналізаваць зямлю, нетры, чыгункі, фабрыкі і г. д. і «абярнуць Англію ў рабочую савецкую рэспубліку, зьвязаную цесным саюзам з СССР».

Прадвыбарчая праграма кампартыі высоўвае між іншым наступныя патрабаваньні, якія трэба безадкладна выканаць: аднаўленьне 7-гадзіннага рабочага дня для гарнякоў; выдача поўнае дапамогі беспрацоўным бяз усялякага скарачэньня; поўнае эканамічнае раўнапраўе; адмена прафсаюзнага закону і г. д.

У галіне сучаснай палітыкі кампартыя патрабуе аднаўленьня дыпляматычных зносін з СССР і падтрыманьня савецкага праекту разбраеньня ў поўным аб'ёме. (ТАСС).

„Гісторыя міжнароднага прафруху—ня ведае падобнай здрады"

ЛЁНДАН, 10. Ангельская кампартыя апублікавала заяву з дакладнымі данымі, якія абвяргаюць «засьцярогу», з якой генэральная рада трэд-юніёну зьвярнулася да арганізаваных рабочых Англіі па повяду забастоўкі тэкстыльшчыкаў у Бамбэі. У гэтай адозве генрады, між іншым, гаворыцца, што саюз, які садзейнічаў забастоўцы, знаходзіцца ў руках камуністых. У гэтым саюзе ўсяго некалькі сот членаў і ён быў утвораны год таму назад.

Далей у адозве зазначалася, што забастоўку ня трэба было абвяшчаць, бо яна зьяўляецца нічым іншым, як «шахматным ходам усходняй палітыкі Камінтэрну».

Ангельская кампартыя заяўляе, што генэральная рада, публікуючы сваю «засьцярогу», падала руку ангельскаму ўраду, забясьпечваючы яго добраахвотна доказамі супроць кіраўнікоў бамбэйскага нацруху, якія знаходзяцца зараз у турме і якіх чакае судовая расправа. «Гісторыя міжнароднага прафруху,—гаворыцца ў заяве,—ня ведае другога падобнага здрадніцтва».

Камуністычная партыя заклікае ангельскую рабочую клясу пратэставаць супроць здрадніцтва генэральнае рады трэд-юніёну і адмовіцца ад падтрыманьня ангельскай рабочай партыі на надыходзячых агульных выбарах.

Падрыхтавацца да перавыбараў у с.-г. каапэрацыі

УСІМ АКРУГКОМАМ КП(б)Ь

У маі-чэрвен. будзе праводзіцца кампанія перавыбараў нізавых кіруючых органаў сыстэмы с.-г. каапэрацыі з усімі не спэцыяльнымі відамі.

Сель.-гаспадарчая каапэрацыя набывае важнейшае значэньне ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі і яе рэканструкцыі, як адзін з галоўнейшых шляхоў ажыцьцяўленьня новых форм змычкі сацыялістычнае прамысловасьці з асноўнымі масамі сялянства. Галоўнейшай задачай усёй сыстэмы сель.-гас. каапэрацыі зьяўляецца калектывізацыя, вытворчае каапэраваньне, як ня толькі рашаючы сродак сапраўднага ўздыму і рэканструкцыі сель.гаспадаркі паляпшэньня эканамічнага становішча бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, а як і сродак выкарчаваньня саміх карэньняў капіталізму ў вёсцы, абмяжоўваючы кулацка-капіталістычную эксплёататарскую дзейнасьць. Таму работа на абагуленьні сялянскіх гаспадарак у калгасы, шпаркае каапэраваньне выклікае абавастрэньне клясавай барацьбы і ўзмацненьне супраціўленьня кулацкіх элемэнтаў сацыялістычнаму будаўніцтву на вёсцы.

Надыходзячыя перавыбары сель-гасп. сыстэмы, як гэта мела месца і пры перавыбарах сельскіх саветаў і спажывецкіх таварыстваў, будуць праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулацкія і інш. антысавецкія элемэнты будуць імкнуцца праляезьці самі і прасунуць сваіх абаронцаў у склад выбарных органаў.

Усё гэта надае надзвычайна вялікую важнасьць надыходзячай кампаніі і патрабуе ад усіх партыйных арганізацый асаблівае увагі.

Значнасьць гэтае кампаніі павялічваецца яшчэ і таму, што апрача задачы недапушчэньня ў склад выбарчых органаў кулакоў і іх абаронцаў, адначасова патрэбна рашуча ачысьціць сучасны склад праўленьняў, асабліва па лініі спэцыяльных відаў ад кулацкіх элемэнтаў.

Асноўнымі задачамі справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінна зьяўляцца:

а) Шырокая папулярызацыя пастановы XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі і разгортваньне практычнай дзейнасьці па далейшым узмацненьні працы ўсёй каапэрацыйнай сыстэмы, паляпшэньні сацыяльнага складу найшчыкаў і кіруючых органаў з тым, каб забясьпечыць выкананьне ўскладаемых на сель.-гас. каапэрацыю задач у справе сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Уся праца як справаздачная, так і перавыбарчая павінна праходзіць пад лёзунгам калектывізацыі, вытворчага каапэраваньня, папярэньня пасеўных плошчаў, узьнікцця ўраджайнасьці і далейшага рашучага наступленьня на кулака.

б) Шырокае разгортваньне работы па далейшым масавым каапэраваньні бядняцка-серадняцкіх мас. Рост каапэраваньня павінен ісьці рашучым выкананьнем пастаноў XV-га зьезду УсеКП(б) аб поўным каапэраваньні беднаты, асабліва завастраючы на гэтым увагу таму, што праца ў гэтым напрамку па ВССР да апошняга часу праводзілася нездавальняюча.

в) Рашучая барацьба за паляпшэньне якасьці працы, у першую чаргу задача забясьпечыць правядзеньне строгай клясавай лініі ва ўсёй рабоце каапэрацыйнай і крэдытнай сыстэмы.

г) Высьвятляючы ўсе дадатныя бакі і дасягненьні, што ёсьць у працы за мінулы час, неабходна рашуча завастрыць пытаньне на буйнейшых недахопах работы. Надыходзячая кампанія павінна зьявіцца масавай праверкай работы каапэрацыйных органаў. Да гэтай праверкі павінны быць прыцягнуты бядняцка-серадняцкія масы.

Ацэнку работы кожнай каапэрацыйнай адзінкі трэба рабіць выходзячы з таго, што практычна зроблена ў справе калектывізацыі, вытворчага каапэраваньня і ўздыму ўраджайнасьці сельскае гаспадаркі, рашуча дабіваючыся ажыцьцяўленьня вызначаных лімітаў у гэтым напрамку.

Пасьпяховае правядзеньне кампаніі залежыць у асноўным ад таго, наколькі нам удасца мабілізаваць актыўнасьць беднаты і батрацтва і замацаваць бядняцка-серадняцкі блёк супроць кулака. Таму асаблівая ўвага партыйных арганізацый павінна быць зьвернута на забесьпячэньне на працягу ўсяго пэрыяду сталым штодзённым кіраўніцтвам, у прыватнасьці ЦК КП(б)Б прапануе:

1) АК і РК КП(б)Б не пазьней 20-га мая распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні кампаніі па ўсіх спэцыяльных відах каапэрацыі (крэдытныя т-вы, калгасы, малочныя, машынныя, пасяльковыя, мэліярацыйныя і інш.).

2) Максымальна разгарнуць працу па арганізацыі беднаты і па забесьпячэньні бядняцка - серадняцкага блёку. Правесьці па ўсіх аб'яднаньнях, за выключэньнем калгасаў (камун і арцеляй), сходы беднаты з прыцягненьнем на іх серадняцкага актыву як у часе справаздачных, так і перавыбарчых сходаў, дэтальна абгаварыўшы ўсе пытаньні працы каапэратыву, складу будучага праўленьня і г. д., рашуча дабіваючыся павялічэньня ў складзе выбарных органаў батракоў, беднаты, жанчынактывістак, з ліку бядняцка-серадняцкіх пластоў і ўзманеньня партыйнага ўплыву як у складзе праўленьняў, так і непасрэдна ў кіруючым складзе.

Склад будучых праўленьняў па ўсіх відах каапэрацыі павінен быць батрацка-бядняцка-серадняцкім.

3) Да пачатку перавыбарчых сходаў пагалоўна перагледзець кіруючы склад працаўнікоў, падрыхтаваўшы новых работнікаў як са складу каапэрацыйнага бядняцка-батрацка-серадняцкага актыву, так і пасылкі з гораду для ўзмацненьня і замены імі негодных падлягаючых замене кулацкіх, што зрасьліся з кулацтвам, разлажыліся і інш. элемэнтаў. Паставіць практычнай задачай, каб кожны акругком вылучыў ня менш 10 чалавек з гораду для ўзмацненьня каапэрацыйнай працы на вёсцы.

Акругкомам КП(б)Б да 1-га чэрвеня паведаміць у ЦК, што практычна зроблена па вылучэньні работнікаў з гораду для ўзмацненьня каапэрацыйнай сыстэмы на вёсцы.

4) Перавыбарная кампанія павінна зьявіцца пераломным момантам па ўзмацненьні работы груп беднаты па ўсіх спэцыяльных відах с.-г. каапэрацыі.

Дасяля гэтага абавязкова патрэбна ўсюды правесьці агляд працы груп беднаты і пасьля перавыбараў арганізаваць новыя групы пры ўсіх крэдытных т-вах, а таксама і пры другіх відах каапэрацыі (малочныя, мэліярацыйныя, машынныя т-вы), дзе ёсьць магчымасьць забясьпечыць партыйным кіраўніцтвам.

5) Кампанія перавыбараў таксама павінна зьявіцца мерапрыемствам па ўзмацненьні крэдытнай сыстэмы і яе грамовага становішча, павялічэньні паявых сродкаў, укладаў і г. д.

ЦК КП(б)Б.

14 УСЕРАСІЙСКІ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ

МАСКВА, 10. Усерасійскі зьезд Саветаў адкрываецца кароткай уступнай прамовай т. Калініна. Пасьля ўшанаваньня памяці памёршых таварышоў Скварцова-Сьцяпанава, Цюрупы, Барысона, Вераб'ёва, Грошава, Лебедзева, Садоўскага, зьезд прыступае да выбару прэзыдыуму.

Выбары прэзыдыуму

У склад прэзыдыуму абіраюцца т. т.: ад цэнтра—Андрэяў, Арцюхіна, Бауман, Бухарын, Варашылаў, Дагадаў, Енукідзэ, Кагановіч, Калінін, Кісялёў, Косыраў, Крупская, Куйбышаў і інш. прадстаўнікі вобласьцяй і аўтаномных рэспублік, краю, гарадоў і г. д. Старшынёй 14-га ўсерасійскага зьезду пад дружныя аплёдысмэнты аднагалосна абіраецца Міхаіл Іванавіч Калінін, сакратаром зьезду А. С. Кісялёў. Абраныя ў склад прэзыдыуму зьезду т. т. займаюць месцы на трыбуне.

Зьяўленьне на трыбуне т. т. Рыкава, Сталіна, Молатава сустракаецца бурнымі аплёдысмэнтамі, што пераходзяць у авацыю.

Зьезд пераходзіць да першага пункту парадку дня,—дакладу ўраду РСФСР. Дакладчыкам выступае т. Рыкаў, сустрэчаны бурнымі аплёдысмэнтамі. Па скончэньні дакладу т. Рыкава першае пасяджэньне зьезду абвешчана закрытым.

***

МАСКВА, 11. На раніпнім пасяджэньні 14-га ўсерасійскага зьезду саветаў 11-га мая пачаліся спрэчкі па справаздачным дакладзе ўраду РСФСР, які быў зроблены 10-га мая т. Рыкавым. Прамоўцы адназгодна выказваюць упэўненасьць, што, ня гледячы ні на якія цяжкасьці, краіна справіцца з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

На вячэрнім пасяджэньні будуць працягвацца спрэчкі па дакладу.

Крызіс фэрмэрскае гаспадаркі ў Амэрыцы

ПЕРШАЕ СУР'ЁЗНАЕ ПАРАЖЭНЬНЕ УРАДУ ГУВЭРА

НЬЮ-ЁРК, 9. Ня гледячы на супярэчаньне прэзыдэнта Гувэра, сэнат прыняў сёньня законапраект аб прэміраваньні вывазу с.-г. прадуктаў. За законапраект галасавалі дэмакраты, а таксама 13 рэспубліканцаў, у тым ліку і Бора, які да гэтага часу рашуча падтрымліваў Гувэра ва ўсіх пытаньнях. «Здрада» 13 сэнатараў-рэспубліканцаў тлумачыцца, відавочна, тым, што насьпявае новы востры крызіс фэрмэрскае гаспадаркі. Цэны на пшаніцу падаюць, дасягнуўшы найбольш нізкага ўзроўню пасьля 1924 году. Да гэтага часу не праданы вельмі значныя рэшткі мінулагодняга ўраджаю зернавых хлябоў; між тым ураджай гэтага году праўдападобна будзе надзвычайна вялікім, што прывядзе да далейшага абвастрэньня крызісу збыту. Падзеньне цэн на хлеб цягне за сабой падзеньне цэн на ўсе наогул с.-г. прадукты. Трэба адзначыць, што ў Канадзе такое-ж становішча. Гэта пабудзіла сэнатараў-рэспубліканцаў, якія прадстаўляюць с.-г. штаты, выступіць супроць Гувэра.

У палітычных колах адзначаюць, што ўрад Гувэра пацярпеў першае сур'ёзнае паражэньне, пасьлізгнуўшыся на тым-жа пытаньні, якое ня раз стварала надзвычайныя затрудненьні для ўрадаў Гардынга і Куліджа. Разам з тым, гэтае паражэньне паказвае, што хаця ў сэнаце і ўзмацнілася рэспубліканская большасьць, але Гувэр ня можа, аднак, цьвёрда разьлічваць на пастаннае падтрыманьне сэнату. (ТАСС).

Касацыйная скарга белабандыта Вайцэхоўскага

ВАРШАВА, 9. Варшаўскі апэляцыйны суд толькі што дэманстрацыйна зьменшыў кару белабандыту Вайцэхоўскаму з 10 гадоў да 5 гадоў катаргі. Але апошняму і гэтага мала. «Роботнік» паведамляе, што Вайцэхоўскі праз сваіх абаронцаў падае касацыйную скаргу ў Вярхоўны суд. Апрача таго абаронцы Вайцэхоўскага робяць стараньні аб пераводзе яго з «Павіяка» ў іншую турму і аб наладжаньні доктарскага агляду яго з прычыны паважнае нібы-та хваробы лёгкіх.

Пляны ворагаў Савецкага Саюзу

КУЛЯБ, 10. Бежанцы з Аўганістану пацьвярджаюць, што Бачэ-Сакао склікаў у Кабуле нараду, на якую запрошаны прадстаўнікі анты-савецкай эміграцыі, якія пражываюць у паўночных правінцыях. З Ханабаду ў Кабул выехала 500 былых басмачэй, якія перад ад'ездам расказвалі, што яны едуць для сакрэтных перагавораў з Ібрагім-Бэкам (адным з правадыроў басмацтва), разам з якімі яны намераны хутка вярнуцца ў прыгранічную паласу для пераходу да актыўных дзеяньняў. Бежанцы пацьвярджаюць, што на нарадзе ў Кабуле прысутнічае былы эмір Бухары Ібрагім-Бэк. (ТАСС).

Роспуск ангельскага парляманту

ЛЁНДАН, 10. Агэнцтва Рэйтэр паведамляе, што падпісан загад аб роспуску парляманту. (ТАСС).

НЕЗАДАВАЛЕНЬНЕ ПЛЯНАМ ЮНГА Ў АНГЛІІ

ЛЁНДАН, 9. Камэнтуючы рэпарацыйныя перагаворы ў цяперашній іх стадыі «Дэйлі Тэлеграф» падкрэсьлівае, што Юнг ня мае паўнамоцтваў прапанаваць зьмену тэзы, устаноўленай у СПА і што ажыцьцяўленьне пляну Юнга азначала-бы для Англіі штогодную страту ў 11 з лішкам мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Лібэральная «Дэйлі Кронікль» заяўляе, што плян Юнга мае яскрава выяўлены анты-ангельскі характар. Газэта дадае «на шчасьце ўсеагульныя выбары надта блізка каб дазволіць Балдуіну і Чэрчылю ўноў здрадзіць Англію».

Катастрафічны голад на Віленшчыне

Ужо нават Варшаўскі буржуазны друк і варшаўскія ўрадавыя колы ня могуць замаязць факту катастрафічнага голаду ў Заходняй Беларусі, асабліва ж ў Віленшчыне. Фашысцкі «Глос Праўды» паведамляе, што 4-га мая ў Варшаве пад «высокім пратэктаратам» пані Масьціцкае, жонкі прэзыдэнта, арганізаваўся «агульнапольскі камітэт дапамогі галадуючай Віленшчыне». Камітэт пастанавіў пачаць збор добраахвотных ахвяраваньняў па ўсёй Польшчы.

Такім чынам справа дапамогі галадуючым замест хуткае дапамогі з дзяржаўных сродкаў (аб неабходнасьці чаго пісала нават манархічна-абшарніцкае «Слово») сьпіхваецца на шлях буржуазнае дабрачыннасьці.

Трэба адзначыць, што сабраныя нават і такім спосабам сродкі пойдуць на дапамогу не бяднейшаму сялянству, якое памірае з голаду а кулаку і асаднику. Кулакі і асаднікі не галадаюць, для іх голад пусты гук, бо фашысцкі ўрад іх не забывае. А вось калі беларускі рабоча-сялянскі клюб хоча дапамагчы бяднейшаму галадаючаму сялянству, дык фашысцкі ўрад ставіць яму розныя перашкоды.

Тым часам урад у мінулым годзе выціснуў з насельнасьці беспасрэдных падаткаў на 47 проц. больш, чым мерквалася па бюджэту. Але замест дапамогі галадаючым фашысцкі ўрад сродкі траціць на піхаманкавае ўзбраеньне з мэтаю нападу на СССР.

Польскі фашызм з усіх сіл стараецца замазаць сапраўдныя прычыны голаду ў Зах. Беларусі. У гэтых адносінах характэрным зьяўляецца выступленьне на пытаньні аб голадзе ў Віленшчыне намесьніка віленскага ваяводы Кірціклісa. Тут і зруйнаваньне вайною Віленшчыны, і аграрная структура і ўзровень гаспадаркі і нават атмасфэрычныя ўмовы. А пра сапраўдныя прычыны голаду—ні слова. Капэніяльная палітыка фашысцкага ўраду, дзікая эксплёатацыя працоўных Зах. Беларусі вось прычыны, якія давялі яе насельніцтва да голаду.

І гэту праўду польскаму фашызму ніколі ня ўдасца замазаць, скрыць, як бы ён ні стараўся.

Кірціклісь прымушан быў прызнаць, што яшчэ дагэтуль польская ўлада не наладзіла нават кармленьня малых дзяцей, якім пагражае хуткая галодная сьмерць, не наладзіла падкармліваньня школьнікаў і дарослых. На ўсё гэта патрэбна ня менш 5 млн. злотых, а ўрад не дае нічога.

Голад выклікаў пашырэньне эпідэмій. Людзі мруць ад голаду і хваробаў, быдла здыхае ад бяскорміцы. Шмат дзе стрэхі пазьдзіраны ўжо на корм скаціне. Не атрымліваючы ніадкуль дапамогі, шмат сялян канчае самагубствам.

Голад адбіўся таксама на гарадох і мястэчках Віленшчыны, па прамысловасьці і гандлі. Напрыклад у Вільні з 751 крамы на 14 вуліцах за адзін 1928 год зачынілася 164. Колькасьць выбраных патэнтаў падае. Колькасьць пратэставаных вэксалёў расьце, у лістападзе 1928 г.—8.462, а ў студзені г. г.—10.321. Колькасьць сэзонных рабочых, запісаўшыхся на выезд у Францыю, у тры разы перавысіла патрэбную лічбу.

Нават гэтыя няпоўныя даныя гучаць, як цяжкае абвінавачаньне на адрасу польскага фашызму.

М. БАРАБЫ.

АДНАДУШНА ЗА ПАСТАНОВЫ 16-й УСЕСАЮЗНАЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ

Пастановы 16-й усесаюзнай партканфэрэнцыі і красавіковага пленуму ЦК знайшлі поўнае аднадушнае ўхваленьне парткалектыву Масквы і Ленінграду. Гэтыя пастановы трэба давесьці да самых пырокіх пралетарскіх мас, каб ня толькі кожны камуністы, але і кожны беспартыйны рабочы, а ў вёсцы батрак, бядняк і серадняк вразумелі іх сутнасьць, вразумелі і новыя задачы, якія стаяць перад партыяй і савецкай краінай, якія прыкоўваюць увагу ня толькі савецкага, але і міжнароднага пралетарыяту.

Якія-ж новыя сацыяльныя працэсы мы маем і якія новыя задачы адгэтуль вынікаюць?

У галіне міжнароднай ужо 15-ты зьезд УсеКП(б) і 6-ты кангрэс Камінтэрну адзначылі новае ў характары стабілізацыі капіталізму, зазначыўшы на абвастрэньне ўнутраных супярэчнасьцяй у лягеры капіталізму, якія ўсё больш расхістваюць яго часовую і нятрывалую стабілізацыю, паказаўшы на элемэнты новага ўздыму рэвалюцыйнага руху пралетарыяту капіталістычных краін і паляпшэньне рабочае клясы. Усе гэтыя новыя моманты высоўваюць і новыя рэвалюцыйныя задачы пралетарыяту: узмацненьне барацьбы супроць сацыял-дэмакратыі, асабліва супроць яе «левага» крыла, супроць рэфармісцкае прафсаюзнае бюракратыі, мабілізацыя рабочых, арганізаваных і асабліва неарганізаваных вакол лёзунгаў Камінтэрну, далейшая энэргічная бальшавізацыя кампартыі і падрыхтоўка мас да будучых клясавых боек. Аднак, правыя і прымірэнцы ва УсеКП(б) і Камінтэрне даюць іншую, супроцьлеглую ацэнку характару стабілізацыі капіталізму, яны пераацэньваюць капіталістычную стабілізацыю, адмаўляюць факт яе нэўстойлівасьці, затушоўваюць рэвалюцыйныя рысы «III-га пэрыяду», рэвізуюць ленінскую ацэнку сучаснае эпохі, як эпохі крызісу капіталізму, эпохі войнаў і сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі і спаўзаюць, такім чынам, да сацыял-дэмакратычнай тэорыі «аздараўленьня» капіталізму. Вось чаму правыя апартуністыя прадстаўляюць у сучасную эпоху галоўную небясьпеку ў міжнародным камуністычным руху.

У галіне ўнутраной у краіне саветаў мы таксама маем новыя працэсы і вынікаючыя адтэуль новыя задачы. Ужо 15-ты зьезд УсеКП(б) падвёў рысу пэрыяду аднаўленьня народнае гаспадаркі, паставіўшы важнейшай гістарычнай задачай — сацыялістычную рэканструкцыю гаспадаркі СССР, каб тым самым узмацніць пазыцыі сацыялізму і ў самы кароткі гістарычны тэрмінгдагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны. Ажыцьцяўляючы сацыялістычную рэканструкцыю, рабочая кляса прыступіла шчыльна да буйнейшай работы па выкарчоўваньні карэньняў капіталізму, да работы па сацыялістычным перабраленьні сельскае гаспадаркі: сувязь пралетарыяту з асноўнымі масамі сялянства ўвайшла ў новую стадыю і набыла новыя формы, усё больш набываючы вытворчы характар (саўгасы, калгасы і г. д.).

Але практычнае вырашэньне задач сацыялістычнай рэканструкцыі ва ўмовах тэхніка-эканамічнай адсталасьці краіны і капіталістычнага акружэньня натыкаецца на няўхільныя труднасьці і супраціўленьне клясавага ворага.

Той, хто ясна разумее пэрспэктывы будаўніцтва сацыялізму, той, хто ясна разумее няўхільныя гаспадарчыя труднасьці і няўхільнае ў даны пэрыяд абвастрэньне клясавай барацьбы,—той паленінску ідзе ў авангардзе сацыялістычнага будаўніцтва, згуртоўвае масы для перамаганьня труднасьцяй, дае рашучы адпор клясаваму ворагу, актыўна змагаецца пад сьцягам ленінізму за ўмацаваньне сацыялістычных пазыцый.

Зусім інакш адносяцца да ўнутранай палітыкі правыя апартуністыя ва УсеКП(б). Яны не заўважваюць клясавых зрухаў, што адбываюцца, яны праводзяць анты-марксыцкую тэорыю мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм, якую партыя зганьбіла, яны ня бачаць абвастрэньня клясавай барацьбы ў сувязі з нашым сацыялістычным наступленьнем.

І ў выніку, замест актыўнай абароны генэральнай лініі партыі—капітуляцтва перад клясавым ворагам, адступленьне перад труднасьцямі рэканструкцыі.

Вось чаму ўсесаюзная партыйная канфэрэнцыя і актывы Масквы, Ленінграду і раду іншых арганізацый УсеКП(б) яшчэ раз з усёй бальшавіцкай суровасьцю сказалі свае слова супроць апартуністычнай пляцформы правай апазыцыі, падкрэсьлілі, што правы ўхіл і прымірэнчыя адносіны да яго ёсьць галоўная небясьпека на даным этапе, што правы ўхіл разбройвае рабочую клясу перад тварам новых, складаных гістарычных задач.

Атрымаўшы рэзкі адпор вьнізу, правыя, як і трацкістыя, узьнялі крык аб заажыме мас, які нібы ёсьць, справавалі спэкуляваць на найбольш цяжкіх «вузкіх мясцох» масавай работы і на адсталых настроях рабочых. Але мы выкрылі паклёп дэзэртыраў сацыялістычнага фронту.

Поўная аднадушнасьць, з якою партыя сустракае пастановы красавіковага пленуму ЦК і ўсесаюзнай канфэрэнцыі, служыць лепшай гарантыяй таму, што партыя пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК пойдзе з посьпехам наперад да новых перамог на сацыялістычным фронце.

«ПРАВДА».

Рашэньні XVI партканфэрэнцыі—у масы

Рэзалюцыя сходу камуністычнага унівэрсытэту імя Леніна па дакладу тав. ГАНТМАНА

Заслухаўшы даклад т. ГАНТМАНА аб выніках аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і XVI партканфэрэнцыі агульны сход калектыву КП(б)Б камуністычнага унівэрсытэту Беларусі імя Леніна ўхваляе ўсе пастановы пленуму і канфэрэнцыі і дапучаецца да рэзалюцыі Менскага гарадзкога партактыву па дакладу т. ГАМАРНІКА.

Сход даручае бюро ячэйкі распрацаваць мерапрыемства па вывучэньні пастаноў XVI партканфэрэнцыі ў калектыве і папулярызацыі гэтых пастаноў сярод працоўных мас гораду і вёскі.

Да IX Усебеларускага Зьезду Саветаў

Пяцігадовы плян беларускай сельска-гаспадарчай каапэрацыі

Уцягнуць 75.000 сялянскіх гаспадараў у калгасы.—24.000.000 руб. на капітальнае будаўніцтва ў каапэрацыі

Тэмп уздыму ўраджайнасьці, пашырэньня пасеўнай плошчы, павышэньня с.-г. тэхнікі, які вызначаецца пяцігодкай, можа быць ажыцьцёўлены толькі шляхам правядзеньня пляну Леніна,—разьвіцьця працэсаў аграмаджаньня.

Для с.-г. каапэрацыі пачатак ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну супадае в карэнным паваротам у зьмесьце і формах працы. Сялянская гаспадарка ўступае ў паласу тэхнічнай і сацыяльна-эканамічнай рэканструкцыі. С.-г. каапэрацыя вяўляецца важнейшым фактарам гэтай рэканструкцыі. Мінулы пэрыяд быў у асноўным пэрыядам адаваяньня ў прыватнага капіталу сфэры таваразвароту.

Таварныя масы аснаўных с.-г. прадуктаў праходзяць ужо па сацыялістычным рэчышчы.

Зараз асноўнай задачай с.-г. каапэрацыі зьяўляецца вытворчае каапэраваньне вёскі. Трэба, аднак, адзначыць, што па якасьці вытворчай працы наша с.-г. каапэрацыя знаходзіцца яшчэ ў самым пачатку свайго шляху. Узровень яе ў гэтых адносінах вельмі нізкі.

Высоўваючы, як цэнтральную задачу на будучы час—вытворчае каапэраваньне, было-б памылкова аслабіць увагу да таваразвароту. Будзе правільна, калі сказаць, што зараз с.-г. каапэрацыя праз каапэраваны таваразварот і крэдыт укараняецца ў сялянскую вытворчасьць і каапэрує сялянскую гаспадарку.

У гэтых адносінах перш за ўсё трэба спыніцца на кантрактацыі. Практыка мінулых гадоў даказвае яе вялізарную ролю ў справе сацыяльнай і тэхнічнай перабудовы вёскі. Разьмеры кантрактацыі зараз ужо такія, што было-б памылковым разглядаць яе толькі, як мэтад загатовак с.-г. прадукцыі. Кантрактацыя зьяўляецца важнейшым зьвяном у комплексе рэканструкцыйных сувязяй паміж сацыялістычным сэктарам і простымі выгворцамі—сялянамі (прыватным вытворчым сэктарам). Неабходна падкрэсьліць наступны вывад, да якога прывяла практыка кантрактацыі. Кантрактацыя зараз зьяўляецца формай такіх эканамічных адносін паміж сацыялістычным сэктарам і сялянствам, калі на грунце плянавага заказу сельскай гаспадаркі на вытворчасьць тэй або іншай прадукцыі пэўнай колькасьці і якасьці, павінен быць разгорнут плян машыназабесьпячэньня, крэдытаваньня, аграабслугоўваньня і г. д.

Такім чынам, правільна разгорнутая і ажыцьцёўленая кантрактацыя зьявіцца асновай для стварэньня вытворчага пляну данага раёну і ўключэньня яго ў агульна-гаспадарчы плян БССР.

Па пяцігодцы намячаецца ажыцьцявіць наступны плян кантрактацыі: ахапіць да канца 1932-33 г. таварнай прадукцыі па ільну-валакне—99 проц., па ільну-насеньні—71 проц., па каноплях—64 проц., па бульбе—61 проц., па зернавых культурах ад 4 да 17 проц., па бэконе сьвіней 5 проц. ад усіх падсьвінкаў, па садавіне 40 проц. Уся закантрактаваная прадукцыя паляводзтва ва ўсёй таварнай масе паляводзтва складае звыш 75 проц. на суму каля 44 міл. руб. Уся кашгоўнасьць закантрактаванай прадукцыі ўсіх відаў сельскай гаспадаркі складае ў 1932-33 г. звыш 51 міл. руб.

Другой важнейшай часткай вытворчай працы с.-г. каапэрацыі зьяўляецца індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі.

У справе мэханізацыі на долю с.-г. індустрыі выпадае вялізарная задача. У пяцігадовым пляне вызначаюцца вялікія тэмпы яе разьвіцьця. У капітальнае будаўніцтва сыстэмы с.-г. каапэрацыі будзе ўложана за 5 год 24 міл. руб. з вучотам зьніжэньня будаўнічага індэксу. З іх сродкаў насельніцтва і каапэрацыі ня менш 4,2 міл. руб., або 17,8 проц. усіх укладаньняў. Прадукцыя, якая выраблеяцца прадпрыемствамі с.-г. каапэрацыі, па першапачатковай пераапрацоўцы дасягне ў 1932-33 г. каля 42 міл. руб.

Калі ўзяць усю агульную вытворчую працу с.-г. каапэрацыі ў 1932-33 г., дык яна вызначыцца: па лініі кантрактацыі ў прадукцыі коштам у 51 міл. руб., па лініі першапачатковай апрацоўкі ў прадукцыі коштам у 42 міл. р., а ўсяго ў 93 міл. руб. Пад усю працу с.-г. каапэрацыі падводзіцца вялікая вытворчая падстава.

На калгасным будаўніцтве намячаецца бурны рост. Звыш 75 тыс. сялянскіх гаспадарак будзе ўцягнута ў калгасы за пяць год. Іх пасеўная плошча складае каля 386 тыс. гэктараў і дасьць к вясьне 1933-34 г. 126.932 тыс. руб. валавой прадукцыі. Іменна на гэтай базе с.-г. каапэрацыя намячае свой плян каапэраваньня насельніцтва.

Па с.-г. крэдытных таварыствах будзе каапэравана на ўсе 100 проц. беднота і ўся асноўная маса серадняцтва. Беднякі будуць уцягнуты ў сыстэму с.-г. каапэрацыі за кошт стваряемых фондаў каапэраваньня беднаты.

Разьмеры ўдзелу с.-г. каапэрацыі ў вэбыце сельскай прадукцыі складзе ў 1932-33 г. прыблізна 125,5 міл. руб., або 75 проц. усяго збыту с.-г. прадукцыі.

Чысты зварот па забесьпячэньні вёскі сродкамі вытворчасьці складзе 85 міл. руб. Гэтая справа будзе амаль поўнасьцю ахоплена с.-г. каапэрацыяй. Такім чынам, с.-г. каапэрацыя ў 1932-33 г. будзе асноўнай, а ў некаторых частках і адзінай формай руху тавараў як з гораду ў вёску, так і з вёскі ў горад.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Генэральная чыстка зробіць партыю яшчэ больш згуртаванай

„Прад'яўляючы да кожнага члена і кандыдата партыі пэўныя запатрабаваньні ў адносінах маральнага ўзроўню, сувязі з масамі, актыўнага ўдзелу ў рабоце партыі, у будаўніцтве сацыялізму і г. д., партыя папярэджвае супроць ператварэньня праверкі ў дробязнае капаньне асабістым жыцьцём партыйцаў, супроць апашленьня самой праверкі, супроць правядзеньня яе не пад кутом погляду клясавых задач „Камуністычнай партыі".

(З рэзалюцыі XVI партканфэрэнцыі).

Не прыніжайце клясавага значэньня чысткі

Пытаньне аб чыстцы вырашана канфэрэнцыяй. На тым, як чыстку праводзіць, досыць падрабязна спыняецца інструкцыя ЦКК. Мне хацелася-б толькі падзяліцца некаторымі агульнымі думкамі, зьвязанымі з чысткаю, падмацаваўшы гэтыя думкі паасобнымі прыкладамі з тых спраў, якія нам у ЦКК даводзілася разьбіраць.

Мы жывем у эпоху, найбольш багатую элемэнтамі сьвядомае творчасьці, калі жыцьцё, сьвет начынае будавацца па пляне. За гэту вялікую справу ператварэньня чалавека і сьвету, у якім ён жыве, упяршыню ўзяліся шчыльна, надзелавому, шырокія масы працоўных на чале з сваёй палітычнай партыяй. Новы сьвет нараджаецца на нашых вачох, і мы яго творым, мы, члены партыі, якія накіроўваем гэта будаўніцтва, кіруем ім. Але будаваць новае вельмі цяжка, шмат цяжэй, чым разбураць старое, і гэтыя труднасьці мы павінны перамагчы, не шкадуючы сваіх сіл, загартоўваючы свой дух, удзесяцяраючы сваю энэргію. Для таго, каб пабудаваць сьвет, у якім кожны будзе даваць па магчымасьці, а атрымліваць па патрэбнасьці, мы зараз павінны працаваць па патрэбнасьці, а атрымліваць па магчымасьці. Адгэтуль сыстэма разьмеркаваньня нашых пазык, адгэтуль кампанія спаборніцтва і вытворчых нарад.

Вось у сьвятле гэтых новых павышаных патрабаваньняў да членаў партыі павінна праходзіць чыстка. У партыі могуць быць, у партыі павінны быць усе тыя, якія здольны калектыўна будаваць новы сацыялістычны сьвет.

Наш быт мае ў сабе, зразумела, элемэнты новага быту, але ў ім значна мацней сядзіць старое, якое трэба перамагчы, але зусім ня дробяным умяшаньнем у асабістае, інтымнае жыцьцё.

Аднак, ня рэдкі выпадкі, калі партыйная арганізацыя ў гэта інтымнае жыцьцё ўмешваецца па ўласным начыне і прад'яўляе досыць рашучыя патрабаваньні. З фэльетону «Фапыстка» («Правда») мы ведаем, да чаго прывяло такое ўмяшаньне. У Беларускай вайсковай акрузе партыйная арганізацыя, паводле неправераных чутак аб ганебных паводзінах і антысавецкіх настроях жонкі камандзіра ўзводу Калько, прымусіла яго разьвесьціся з ёю. Як т. Калько ні ўпіраўся, як не даводзіў, што абвінавачаньні нічым не пацьвярджаюцца, арганізацыя настойвала на сваім. А тав. Калько быў вытрыманым партыйцам і добрым камандзірам; ён два гады правёў на фронце кулямётчікам і з 1918 г. да гэтага часу ў Чырвонай армі; ён быў і сакратаром эскадроннай ячэйкі да 1928 году. Тав. Калько падпарадкаваўся пастановам арганізацыі і разьвёўся з жонкаю. У выніку жонка стрэлам з рэвальвэру забіла яго і сябе. Калі сталі больш дакладна разьбіраць справу, усе абвінавачаньні супроць жонкі Калько былі непраўдзівыя. У часе разбору справы ў нас, у ЦКК, адзін з вайсковых таварышоў зусім сур'ёзна даводзіў, што ў вайсковым асяродзішчы вельмі шмат няпрыемнасьцяй дастаўляюць «неадпатыповыя» жонкі вайскоўцаў, што гэта служыць крыніцай усякіх плётак і склок. У Церскай акрузе камандзіра Кузьняцова на шматлюдным партсходзе, прысьвечаным чысткі, запыталіся, чаму ён жанаты на дачцы папа; у Курску ад камуністкі дамагаліся, каб яна разышлася з беспартыйным мужам; у Бранску камуністага Саломенната прасьледуюць за тое, што яго жонка быццам раней мела мужа з чужога асяродзішчы, і яна скардзіцца ў ЦКК, запэўняючы, што абвінавачаньне нягрунтоўнае, бо былы яе муж быў цалкам савецкім чалавекам.

Як бачыце, дзе-ні-дзе нашы таварышы ня маюць нічога супроць зьвесьці чыстку партыі да разбору таго, у якой ступені жонка адпавядае мужу—члену партыі (ці наадварот), і высоўваецца абвінавачаньне аб сувязі з чужым элемэнтам. Дзе-ні-дзе нават стварылі бытавыя камісіі па чысткі, якія наводзяць справаўкі ў дамкомах аб паводзінах члена партыі, аб тым, хто ў яго бывае, ці ня п'е ён, а калі п'е, дык як часта і з кім. Тут няўхільна будуць вэбіцца на зьвядзеньне асабістых рахункаў і падседжваньне пад сьцягам клопатаў аб чыстаце партыі.

Вось гэта ўсё трывожыць: як-бы ў паасобных выпадках ня зьнізіць значэньня чысткі. Паасобныя дробныя факты можа што-колечы і гаварыць пра члена партыі, але не адказваюць на асноўнае пытаньне, ці зьяўляецца ён будаўнікам сацыялізму, ці жыве ён інтарэсамі партыі, ці праводзіць ён у сваёй практычнай рабоце партыйныя дырэктывы.

Я нядаўна атрымаў ліст ад аднаго маладога беларускага таварыша. Ён, паводле яго слоў, «сакратар камсамольскай ячэйкі, карыстаецца аўтарытэтам, прасоўваецца на службе, атрымаў першую прэмію на конкурсе служачых, высоўваецца ў члены гарсавету», а адчуває сябе акружаным балотам, адчуває, «як едкая іржа распаўзаецца ўнутры яго, нейкая пустэча ўнутры, ня бачыш выніку».

Дарагі таварыш, гэтыя вынікі трэба ўмець бачыць. Да рэвалюцыі людзі адседжвалі гады ў турме за выказанае або надрукаванае слова, а вы хочаце зараз-жа рэальных вынікаў і хныкаеце і ныеце в повуду таго, што акружаючыя людзі вас не здавальняюць. Мы ня можам прадаставіць у ваша распараджэньне іншы чалавечы матар'ял.

З сучаснымі кадрамі мы зрабілі рэвалюцыю, в імі мы павінны перабудаваць сьвет. Партыя патрабуе барацьбы з правым ухілам, а сутнасьць яго ў тым, што члены партыі перастаюць бачыць, адчуваць тую вялікую справу, якая творыцца ў нашым Саюзе. Гэта трэба перамагчы. Пры нашым грамадзкім ладзе па-за гранай вялікай работай сапраўды няма чым жыць. Асабістае цесна сплятаецца з калектыўным і па-за апошнім няма выхаду. Хто гэтага ня ўспрымае, таму няма месца ў партыі і вельмі мала месца ў нашым савецкім жыцьці.

Павышаюцца патрабаваньні ў нашай рабоце. Гэта датычыць усіх працоўных мас і вытворчых працаўнікоў, іх абслугоўваючых, а ў першую чаргу членаў партыі, перадавога атраду гэтых працоўных мас.

Так будзе, пакуль галоўныя труднасьці ня будуць пераможаны, пакуль будаўніцтва сацыялізму ня стане настолькі моцным і плянамерным, што можна будзе перайсьці да патрабаваньня ад кожнага на яго магчымасьцях і надзяленьня яго па патрэбнасьцях. Гэта сапраўды апошні і рашучы, хоць досыць доўгі бой. І каб перамагчы ў ім, трэба шмат упартасьці, сьмеласьці і мужнасьці.

(«Пр.») **А. СОЛЬЦ.**

Асноўная задача

Уся гісторыя нашай партыі, усе яе прынцыпы, яе статут, яе практыка—усё гэта пранізана аднэй думкаю: наша партыя—партыя рабочае клясы, наша партыя—баявая партыя, партыя, якая змагаецца за перамогу пралетарыяту ва ўсім сьвеце.

Баявая партыя, якая змагаецца за сацыялізм, павінна сачыць за чыстатой сваіх радоў, бо ад гэтага, у першую чаргу, залежыць яе баяздольнасьць, яе ідэёвая згуртаванасьць.

Гэта ачышчэньне радоў у розныя пэрыяды дзейнасьці партыі праходзіла пасобнуму. Да рэвалюцыі, у абставінах нелегальнага існаваньня, партыя ачышчалася ў вагні выпрабаваньняў. У гады паражэньняў і найбольш цяжкіх пераживаньняў усё нягоднае для барацьбы адыходзіла ад партыі. У гады зьніжэньня рэвалюцыйнай хвалі наглядаліся ідэёва-палітычныя хістаньні—і тады па гэтай лініі таксама адбывалася ачышчэньне радоў партыі.

Ва ўсіх у памяці чыстка 1921 г. Партыя тады павінна была вызваліцца ад чужых, выпадковых элемэнтаў, ад людзей уцягнутых стыхіяй вайны, але ідэёва ня прыстаўшых да партыі.

16-я ўсесаюзная канфэрэнцыя партыі, што нядаўна закончылася, прыняла пастанову аб новай чысткі партыі. Якія задачы гэтай чысткі?

Гэтыя задачы азначаюцца тым палажэньнем, што партыя падышла шчыльна да сацыялістычнага будаўніцтва, якое праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы з капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі.

Каб весьці гэтую барацьбу з найлепшымі вынікамі, партыя павінна праверыць прыгоднасьць кожнай сваёй арганізацыі, кожнага яе члена.

Партыя звыш 11 год трымае ўладу ў сваіх руках, застаючыся ў той-жа час адзінай легальнай партыяй у краіне.

Гэта становішча дапамагае пранікненьню ў рады партыі кар'ерыстых бюракратаў, карысьлівых людзей, якія стараюцца скарыстаць перавагі кіруючай партыі.

Такія элемэнты ёсьць і ў горадзе, і ў вёсцы.

З другога боку, ва ўСеКП(б) увайшлі значныя праслойкі выхадцаў з іншых партый, ня зусім пралетарскіх. За гады рэвалюцыі распаўся цэлы рад партый і значны лік іх членаў апынуўся ў радох УсеКП(б).

Чыстка і праверка павінны паказаць, наколькі зьліліся, ідэёва пераапрацаваліся выхадцы з іншых партый і чужых пралетарыяту сацыяльных праслоек. Сярод былых эсэраў мы зможам выкрыць правыя падкулачныя настроі па пытаньні аб палітыцы партыі ў вёсцы. Сярод былых нацыяналаў мы можам выкрыць шавіністычныя ўхілы.

Сярод расійскіх інтэлігэнтаў—вялікадзяржаўны душок і г. д.

Нарэшце, мы можам пры чысткі стыкнуцца з бюракратычным перараджэньнем паасобных клетак партыі, адрывам ад мас старых падпольшчыкаў, пралетараў, забыцьцём мэт нашае барацьбы, стратай інтэрнацыянальных сацыялістычных пэрспэктыў і г. д.

Задача чысткі—вызваліць партыю ад чужых элемэнтаў, ад элемэнтаў, якія страцілі баяздольнасьць, ад усіх тых, для каго чужымі зьяўляюцца задачы сацыялістычнага будаўніцтва, што стаяць перад партыяй, якое мы можам ажыцьцявіць толькі пры ўмове ўзмоцненага наступленьня на клясавых ворагаў. Мы бясспрэчна выкрыем і ў горадзе і ў вёсцы факты зблiжэньня членаў партыі з сацыяльна-чужымі элемэнтамі (нэпман, кулак), мы бясспрэчна сутыкнёмся з такімі членамі партыі, якія ўжо няпрыгодны для барацьбы з кулаком і гарадзкімі капіталістым. Ясна, што партыя павінна будзе ад іх пазбавіцца.

Такім чынам, упор чысткі зроблен на праверку клясавага твару камуністага. Гэта ў даных умовах самае важнае.

Гэта ня значыць, што чыстка не закране пытаньняў бытавога загнываньня камуністых. Чыстка партарганізацый дазволіць партыі ўзмацніць клясавы пралетарскі ўплыў у вёсцы, дазволіць узмацніць работу сельскіх камуністых па калектывізацыі вёскі, па згуртаваньні беднаты і серадняку для барацьбы з кулаком.

Партыя выйдзе з чысткі памацнеўшай палітычна і арганізацыйна, павялічыўшы свае рады за лік новых мас гарадзкога і сельскага пралетарыяту.

В. ГРЫШАНІН.

Менская партарганізацыя напярэдадні чысткі

У Кастрычнікаўскім раёне

Падрыхтоўка да чысткі партыі ў Кастрычнікаўскай арганізацыі КП(б)Б пачалася зараз-жа пасьля лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б).

Яшчэ некалькі месяцаў таму назад райком даў дырэктывы ўсім ячэйкам аб практычным правядзеньні падрыхтоўчай работы да чысткі. Усе ячэйкі дэтальна прапрацавалі тэзісы тав. Яраслаўскага і намецілі мерапрыемствы па падрыхтоўчай рабоце.

Складаньне характарыстык на кожную ячэйку ўвязваецца з самаправеркай ячэек пры перавыбарах бюро. Гэта праца будзе скончана да 1-га чэрвеня.

У камісіі па чысткі Кастрычнікаўскай арганізацыі вылучаны 41 чалавек, з іх рабочых—84 проц., рэшта—сяляне і служачыя з вялікім стажам падпольнае работы. Кандыдатуры, вылучаныя ў камісіі па чысткі, зараз усебакова абгаворваюцца ў ячэйках.

У сувязі з чысткай, райком завастрыў асаблівую ўвагу ячэек на рабоце па вэрбоўцы ў партыю перадавых актыўных рабочых. На гэтым фронце арганізацыі ўдалося ўжо дабіцца значных посьпехаў. За апошнія пяць месяцаў па ячэйках Кастрычнікаўскага раёну ПРЫНЯТА Ў РАДЫ КП(б)Б 148 РАБОЧЫХ АД ВАРШТАТУ.

Разам з падрыхтоўчай работай да генэральнай чысткі арганізацыя ўжо зараз выяўляе тых, што прымазаліся да партыі. За апошні час Кастрычнікаўскі райком КП(б)Б выключыў з партыі 45 чалавек за розныя антыпартыйныя ўчынкі.

У Фрунзаўскім раёне

Партыйныя ячэйкі Фрунзаўскага раёну правялі вялікую падрыхтоўчую работу да чысткі партыі.

На адкрытых партыйных сходах, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб чысткі партыі, прысутнічала шмат беспартыйных рабочых і работніц. На заводзе „Дрэваапрацоўшчык" у абгаварэньні тэзісаў тав. Яраслаўскага ўдзельнічала каля 100 беспартыйных рабочых.

У камісіі па чысткі намечана 40 рабочых з вялікім вытворчым і партыйным стажам.

Пры ячэйках вылучаны спэцыяльныя камісіі па самаправерцы. Гэтыя камісіі прыступаюць да работы. Ячэйкі не паслабляюць работы па вэрбоўцы старых рабочых у партыю. Ячэйка заводу «Дрэваапрацоўшчык» прыняла ў свае рады 6 рабочых ад варштату з вытворчым стажам ад 15 да 30 год. У бюро ячэйкі 1-й дзяржкарні паступіла калектыўная заява некальких старых рабочых аб прыёме ў рады КП(б)Б.

Трэба адзначыць, што ячэйкі пачалі ўжо паступова «самаачышчацца». За апошнія некалькі месяцаў па арганізацыі выключана з партыі за разлажэньне і антыпартыйныя ўчынкі больш 100 чалавек.

Лепш падрыхтавацца

Адсутнасьць добрай падрыхтоўкі прывядзе да непатрэбных памылак

Праверыць работу кожнай установы, кожнага аддзелу, кожнага працаўніка,—вось асноўная задача падрыхтоўкі ДА ЧЫСТКІ АПАРАТУ

НЯСУР'ЁЗНЫЯ ЖАДАНЬНІ

З моманту дачы дырэктыў адпаведным арганізацыям Беларусі аб чысткі савецкага апарату прайшло ўжо больш 2-х месяцаў. Тады-ж пачалася падрыхтоўчая работа. Аднак, ня гледзячы на параўнаўча вялікі пэрыяд да сёнешняга дня гэта падрыхтоўчая работа нават у асноўным яшчэ не закончана і таму да фактычнай чысткі апарату прыступіць няма магчымасьці. У той-жа час некаторыя работнікі жадаюць ужо прыступіць да чысткі, лічачы, што няма нічога страшнага і што можна незакончаную падрыхтоўку навярстаць «на ходу», г. зн. у самым працэсе чысткі. Такія жаданьні і такія настроі павінны быць адхілены, як нясур'ёзныя і шкодныя, якія фактычна тармозяць вядзеньне падрыхтоўчай работы да чысткі. Праводзіць такое вялікае і складанае мерапрыемства, якое мае буйное значэньне, і ня быць падрыхтаванымі, як трэба,—гэта значыць пацярпець у гэтай рабоце няўдачу. Ня трэба ісьці на гэта. У якой меры будзе праведзена падрыхтоўчая работа да чысткі, у такой-жа меры будуць і вынікі. Таму, да таго часу, пакуль ня будзе ўпэўненасьці ў тым, што падрыхтоўчая работа да чысткі, г. зн. работа, накіраваная ў асноўным да мабілізацыі грамадзкае ўвагі самых шырокіх пралетарскіх мас горада і вёскі, да арганізацыі поўнага падтрыманьня і практычнага ўдзелу ў іх боку ў гэтай справе, да зьбіраньня адпаведных матар'ялаў, да падрыхтоўкі замены і інш., да таго часу, пакуль гэта ў асноўным ня будзе закончана,—да фактычнай чысткі нельга прыступіць.

ПАЧАЦЬ ЧЫСТКУ У МАІ

Побач з гэтым неабходна падкрэсьліць, што падаўжэньне тэрміну пачатку чысткі шкодна адбіваецца на рабоце апарату. Кожны з работнікаў знаходзіцца ў жімсьці напружаным стане, чагосьці чакае, бегае па ўстановах, шукае паперкі, водпуску, атэстату, спраўкі і інш. Гэтым паслабляецца інтарэс служачага да работы, яго працаздольнасьць паніжаецца. А ёсьць і процілеглыя зьявішчы, калі служачыя стараюцца быць «акуратнымі», прыходзяць на работу на паўгадзіны раней, ідуць пазьней. Іменна таму **неабходна ўсім, хто зьвязан з гэтай работай, падцягнуцца і падцягнуць, як сьлед, тых,** хто абавязан прымаць удзел ва ўсёй гэтай рабоце, больш рашуча і сур'ёзна ўзяцца за сканчэньне падрыхтоўчай работы да чысткі апарату з такім разьлікам, каб **абавязкова** ў маі прыступіць да фактычнай чысткі савецкага апарату ўстаноўленай чаргі.

НЕДАХОПЫ ПАДРЫХТОЎЧАЙ ПРАЦЫ

Да гэтага часу падрыхтоўчая работа рабілася ў наступным напрамку: шырокім пралетарскім масам растлумачваліся мэты, задачы і парадак падыходзячай чысткі, г. зн. падрыхтоўка была накіравана да прыцягненьня ўвагі шырокіх пралетарскіх мас і правільнай іх арыентацыі ў гэтых пытаньнях (даклады на сходах, асьвятленьне ў друку і г. д.), праводзіліся некаторыя арганізацыйныя мерапрыемствы па прыцягненьні да актыўнага ўдзелу ў гэтай рабоце рабочых з вытворчасьці і мясцовых арганізацый і ўстаноў, непасрэдна зьвязаных з гэтай работай (арганізацыя рабочых брыгад, прыцягненьне «лёгкай кавалерыі», жанчын-дэлегатак, членаў сэкцыі РСІ, арганізацыя «камісій садзейнічаньня» ва ўстановах, нарад прадстаўнікоў ведамстваў, зьвязаных з падрыхтоўкай матар'ялаў, інструктаваньне нарад і сходаў, бюро ячэек, камісій садзейнічаньня, лёгкіх кавалерыстых, рабкораў і інш.); зьбіраліся адпаведныя матар'ялы на работнікаў апарату і, нарэшце, праводзіліся некаторыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы замены. Праўда, у адносінах апошніх двух мерапрыемстваў, у даны момант найбольш важных, прароблена вельмі невялікая работа і па сваёй якасьці нездавальняючая.

ПРАВЕРЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ

Перад намі стаіць задача: «чыстка савецкага апарату ад элемэнтаў, што разлажылися, што скажаюць савецкія законы, зрошчываюцца з кулаком і нэпманам, перашкаджаюць змагацца з цыганінай, і тых, хто яе прыкрывае, высокамерна, пачыноўніцку, пабюракратычнаму адносіцца да пільных патрэб працоўных, ад растратчыкаў, хабарнікаў, сабатажнікаў, шкоднікаў, гультаёў». (З рэзалюцыі XVI партканфэрэнцыі).

Пры гэтым «чыстка павінна праводзіцца, раней усяго і галоўным чынам, на падставе ацэнкі якасьці работы, а ня толькі адзнак клясавага пахаджэньня» (з тэй-жа рэзалюцыі). Ці маем мы даволі матар'ялу, які-б і якасна нас зусім здаволіў на работнікаў апарату, іменна выходзячы з гэтай установкі? Ці вядзецца падрыхтоўчая работа іменна ў гэтым напрамку? Ня гледзячы на тое, што нашы ранейшыя дырэктывы адпавядаюць гэтай установцы, азнаямленьне з ходам падрыхтоўчай работы на мясцох, а таксама і ў цэнтральных установах дае падставу рабіць вывад, што далёка ня ўсюды падрыхтоўчая работа і сабраны (і зьбіраемы) матар'ял адказвае гэтым патрабаваньням.

Як можна ацаніць якасьць работы таго ці іншага работніка, г. зн. устанавіць, ці скажае ён савецкія законы або не, ці зрошчваецца ён з кулаком і нэпманам, або не, ці зьяўляецца ён бюракратам, валакітчыкам, ці не,—**калі не праверыць гэту работу? Толькі праверыўшы грунтоўна работу кожнага работніка, праверыўшы на практычнай справе, як ён працуе,—можна вызначыць якасьць таго ці іншага работніка.** Якраз на гэты момант, трэба проста сказаць, ва многіх мясцох зварачалася вельмі мала ўвагі.

АДЗІН АД ДРУГОГА СЬПІСВАЕ

У гэтых мясцох падрыхтоўчая работа і зьбіраньне матар'ялаў ідзе пераважна па лініі выяўленьня даных аб работніках апарату, што характарызуюць амаль выключна іх сацыяльнае пахаджэньне, або пахаджэньне па службе. Часта гэтым займаецца адначасова рад установ (5-6) і наглядаюцца выпадкі, калі адна ўстанова сьпісвае матар'ялы ад другое ўстановы, прычым думаюць, што робяць вялікую справу. Словам, наглядаецца нейкае захапленьне гэтай работай, траціць на гэта шмат энэргіі і часу, ня гледзячы на больш важную задачу—правядзеньне падрыхтоўчай работы да чысткі апарату, вывучэньне якасьці работы апарату цалкам, яго часьцей і кожнага работніка паасобку.

СПРАВА НЯ ТОЛЬКІ Ў САЦЫЯЛЬНЫМ ПАХАДЖЭНЬНІ

Вельмі важна, зразумела, мець даныя аб работніку, якія высьвятляюць яго сацыяльнае становішча або пахаджэньне. Аднак, гэта зусім **невыстарчальна.** Якая карысьць з таго, што мы ведаем, што такі і такі каморнік находзіць з былой дваранскай сям'і і быў чыноўнікам старой земскай управы, ці такі і такі лесавод паходзіць з папоўскай сям'і і працаваў у мінулым у памешчыка, або такі і такі фініспэктар паходзіць з сям'і рабочага і ў мінулым быў сам рабочы, або такі і такі сьледчы ці народны судзьдзя паходзіць з сялян і г. д.,—калі мы ня маем іншых даных, асабліва тых, што характарызуюць яго, **як работніка,** характарызуюць **якасьць і каштоўнасьць** яго работы на сёнешні дзень, яго здольнасьці праводзіць правільна савецкія законы і партыйныя дырэктывы пры зямляўпарадкаваньні, спагнаньні падаткаў, рэвалюцыйнай законнасьці і г. д.

Вось, калі да гэтых даных, якія характарызуюць яго работу, дадаць весткі аб яго сацыяльным становішчы, або пахаджэньні, тады можна будзе правільна вырашыць пытаньне аб далейшым яго прабываньні ў савецкім апараце. Скажам, калі ў нас была магчымасьць высьветліць, праверыўшы грунтоўна работу хаця-б таго-ж каморніка (шляхам праверкі раду зямляўпарадчых спраў), што ён добрасумленна, у духу нашай партыі, нашай лініі, ня гледзячы на напіск і пагрозу кулацтва, мужна праводзіць сваю работу,—мы зможам, ня гледзячы на тое, што ён паходзіць з былой дваранскай сям'і і быў чыноўнікам старой земскай управы, вырашыць пытаньне ў станоўчым сэнсе, каб пакінуць яго на рабоце. Або, наадварот, возьмем фініспэктара пралетарскага пахаджэньня. Але, калі выяўлена, шляхам праверкі яго работы, скрыўленьне партыйнай лініі (ці недаабкладаньне кулака і нэпмана, пераабкладаньне саматужніка і інш.),—яго трэба зьняць з работы. Тут пры вырашэньні пытаньня моманты сацыяльнага пахаджэньня або ранейшая работа маюць значэньне толькі пры вызначэньні меры пакараньня (зьняць зусім з работы, або перавесьці на другую работу ў іншую ўстанову). Аднак, і ў гэтым выпадку **неабходна** ведаць, як ён працаваў.

У гэтым зараз павінен быць цэнтр цяжкасьці далейшай падрыхтоўчай работы да чысткі апарату, у гэты бок павінна быць накіравана ўвага ўсёй пралетарскай грамадзкасьці гораду і вёскі.

ШТО ПАВІНЕН ДАЦЬ АГЛЯД УСТАНОЎ

Вельмі важную ролю ў гэтай справе можа і павінен адыграць арганізаваны дзяпер праз газэты (агульныя і насьценныя) агляд установ. Галоўная задача агляду—узяць пад абстрэл працеўны работу нашых установ, што належаць да чысткі, галоўным чынам выяўляючы адмоўныя моманты ў іх рабоце (установы цалкам, асобныя яе часьці), а таксама работу кожнага работніка паасобку. Зразумела, што ўсю работу гэтых установ зараз браць пад абстрэл ня трэба, а неабходна згрупаваць увагу на галоўных момантах, у тэй або іншай меры зьвязаных з задачамі чысткі апарату, што могуць выявіць правільнасьці правядзеньня клясавай лініі ў рабоце, цяганіну, высокамерна-чыноўніцкія бюракратычныя адносіны да важных патрэб працоўных, шкодніцтва, сабатаж, хабарніцтва і інш. агіднасьці, і на аснове ўсяго гэтага выяўляць канкрэтных насіцеляў зла.

Справе арганізацыі і правядзеньню гэтага агляду установ газэты павінны аддаць асаблівую ўвагу, мабілізуючы для гэтага ўсю сваю рабкораўскую армію, павінны забясьпечыць удзел самых шырокіх пралетарскіх мас, праяўляючы пры гэтым асаблівую гібкасьць і арганізатарскую здольнасьць для забясьпячэньня посьпеху ў гэтай рабоце.

Аднак, ускладваць усю гэту работу і ўсе надзеі выключна на газэты нельга. Тут неабходны ў максымальнай меры ўдзел **партыйных арганізацый,** асабліва мясцовых партыйных ячэек, якія **павінны** ведаць работу сваёй установы і кожнага працаўніка паасобку; **кіраўнікоў установ,** якія, дарэчы сказаць, вельмі мала займаюцца пытаньнем чысткі апарату («гэта справа РСІ», як быццам яны не адказваюць за апарат), **прафсаюзаў і іх мясцкомаў, эканомкамісіі, рабочых брыгад** і інш. органаў, якія могуць і павінны прыняць удзел у справе выяўленьня работы ўстаноў і працаўнікоў, што ў іх працуюць.

НЯ ІСЬЦІ ПА ЛІНІІ НАЙМЕНШАГА СУПРАЦІЎЛЕНЬНЯ

Толькі тады, ставячы пытаньне аб падрыхтоўчы да чысткі апарату, мы зможам правільна вырашыць задачу самой чысткі. Справа гэта, зразумела, нялёгкая, значна больш трудная, чым выявіць адно толькі сацыяльнае пахаджэньне працаўніка. Але ісьці па лініі найменшага супраціўленьня, г. зн. абмежавацца лёгкай работай (з якою, бадай, адна з нашых установ і без такой кампаніі магла-б справіцца), калі гэта задача значна сур'ёзьней і шырэй, ніяк нельга.

Ня менш важная работа па падрыхтоўцы замены. І тут становішча ня вельмі добрае. Але аб гэтым у наступны раз.

РЫСЬКІН.

ДА ВЯРБОЎКІ У ВАЙСКОВЫЯ ШКОЛЫ

НАШ ЗАКЛІК ДА РАБОЧАЙ І БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКАЙ МОЛАДЗІ

Аднэй з важнейшых задач нашага вайсковага будаўніцтва зьяўляецца падрыхтоўка новых камандна-палітычных кадраў РСЧА. Гэта пытаньне зьяўляецца актуальным, ня гледзячы на тое, што ў асноўным праблема кадраў камандзтаву складу ўжо намі вырашана. Наш камандна-палітычны склад палітычна ўстойлівы, досыць падрыхтаваны ў вайсковых адносінах і зьяўляецца асноўнай сілай, якая гуртуе рабочасялянскія масы арміі вакол лёзунгаў і ідэй савецкае ўлады і камуністычнае партыі.

Мы ставім сваёй мэтай узмацняць у кожным новым папаўненьні камандзтаву складу пралетарскае ядро. Разам з тым, мы надаем вялікае значэньне справе ўцягненьня ў вайсковую школу батрацтва і вясковай беднаты. У бягучым годзе мы паставілі задачай кампаніі па вэрбоўцы ў вайсковыя школы забясьпечыць у папаўненьні 60 проц. рабочых і дзяцей рабочых, а ў складзе сялян ня менш 50 проц. батрацтва.

Гэта задача можа быць вырашана толькі ў тым выпадку, калі партыйныя і камсамольскія арганізацыі аддадуць справе вэрбоўкі ў ВНУ самую пільную ўвагу, калі асабліва прафэсыянальныя саюзы, савецкая грамадзкасьць і Асавіяхім паставяць у плян свае работы ўцягненьне рабочага маладняка ў вайсковыя школы. Паводле існуючых даных саюз працаўнікоў зямлі і лесу праяўляе вялікую актыўнасьць у справе вэрбоўкі батрацтва ў вайсковыя школы, арганізуе адбор лепшых элемэнтаў батрацтва, папярэднюю падрыхтоўку да іспытаў і разьвівае антыцыўна-прапагандысцкую работу. Прыкладу саюзу ўсепрацземлес павінны пасьледаваць індустрыяльныя саюзы, якія пакуль што яшчэ, на вялікі жаль, слаба і марудна разварушваюцца. Практыка мінулага году паказала, што пры ўважлівых адносінах да справы вэрбоўкі ў вайсковыя школы мы дасягаем сур'ёзных вынікаў; у 1928 годзе рабочая праслойка сярод паступіўшых у нашы вайскова-навучальныя ўстановы дасягнула 56 проц. (супроць 39 проц. у мінулым годзе).

Галоўнай слабасьцю кампаніі па вэрбоўцы і ў мінулым і ў бягучым годзе было тое, што нашы вэрбовачныя органы дрэнна даводзілі сваю работу да цэху і да вёскі. У гэтым годзе трэба ўжываць гэты недахоп. Рабоча-сялянскі маладняк і ў першую чаргу камуністычная і камсамольская моладзь ўсё яшчэ невыстарчальна асьвядомлены аб ролі і становішчы каманднага складу ў Чырвонай арміі. Партарганізацыі, камсамол і прафсаюзы павінны дапамагчы пралетарскаму маладняку падрабязна азнаёміцца з нашымі вайсковымі школамі і ўмовамі паступленьня ў іх. Пралетарская і батрацка-бядняцкая моладзь павінна ведаць усю важнасьць для нашае дзяржавы Чырвонае арміі і не станавага хрыбта—каманднага складу.

Дакладны адбор, уважлівая праверка сацыяльна-палітычнага твару кандыдатаў, якія ідуць у вайсковую школу ў бягучым годзе, патрэбны больш, чым калі небудзь.

Я цьвёрда пераконаны, што наш заклік да рабочай і батрацка-бядняцкай моладзі аб уступленьні ў вайсковую школу знойдзе неадкладны жывы водгук, і камплектаваньне вайсковых школ у бягучым годзе дасьць яшчэ больш станоўчыя вынікі, чым летась.

К. ВАРАШЫЛАЎ.

Абсьледваньне гандлёвых арганізацый

Выяўлены рад выпадкаў павышэньня цэн

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). У красавіку было праведзена абсьледваньне магазынаў дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый. Абсьледваньне праводзілася з пункту погляду праверкі калькуляцый гандлёвых арганізацый. У Цэрабкопе па таварах, якія рэгулююцца, не наглядаецца павышэньня цэн. Павышэньне выяўлена толькі па 23 відах нерэгулюемых тавараў, у сярэднім на 16,4 проц. Выяўлены разнабой паміж цэнамі раздробнымі і прэйскурантнымі на мяса, наскі і хусьцінкі да носу.

У «Працгандлі» на рэгулюемых таварах павышэньне цэн ёсьць па некаторых відах мэталятавараў за кошт павялічэньня пакупных цэн і па скураных таварах за кошт павялічэньня продажных цэн. Па рэгулюемых таварах павышэньне цэн наглядалася па 6 відах тавараў.

У інваліднай каапэрацыі адзначана парушэньне цэн па нерэгулюемых таварах. З правераных 22 відаў тавараў павялічэньне цэн было па 6 відах.

Па Белмясгандлі выяўлена павялічэньне на цяляціну і сьвіное сала. Абслугоўваньне спажыўца ня добра пастаўлена і ў магазынах ЦРК. Наглядаюцца чаргі ў магазынах, кепска пастаўлена папярэдняя фасоўка тавараў, прэйскуранты ня ўсюды вывешаны, кпігі скаргаў на крамах не заведзены.

***

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Праверцы раздробных цэн быў наданы грамадзкі характар. Раздробныя цэны і надбаўкі праверваны ў ЦРК, спажывецкім таварыстве «Чырвоны Ратай», сельска-гаспадарчым таварыстве «Чырвоны Ратай» і інш.

Абсьледваньнем выяўлена павышэньне цэн і надбавак у першым паўгодзьдзі 1928-29 году на непарманаваныя тавары.

Выяўлена павышэньне цэн на галянтарэйныя тавары ў ЦРК на 14 проц., канцылярскія прылады—5,5 проц., жалеза-скабяныя тавары—1,5 проц., мэблю—1,5 проц., кандытэрскія вырабы—8 проц. і інш.

Характэрным зьяўляецца тое, што ўсюды павялічаны надбаўкі на паперу і канцылярскія прылады. Былі выпадкі праяўмерна вялікіх надбавак на некаторыя непарманаваныя тавары, як напрыклад, па Рагачэўскім гар. спажывецкім таварыстве на капусту—54 процанты, бульбу—27 процантаў, фрукты—36 процантаў, каўбасу—28 проц., соду што піць—32 процанты, соду для бялізны—43 процанты, ванілін—45 проц. і г. д.

Яшчэ 18 новых пасёлкаў

(Новасёлкаўскі сельсавет, Меншчына)

Імкненьне сялян да ўзмацненьня новых форм зямлякарыстаньня ў нашым сельсавеце з кожным годам усё павялічваецца. Вядома, што весьці гаспадарку падзедаўскаму спосабу і жыць так далей на вузкіх палосках кожнаму ў вёсцы ўжо абрыдзела. Амаль усе гаспадары нашага сельсавету, якія ня вышлі яшчэ на пасёлкі, імкнуцца перайсьці на шыркія палі, каб з пераходам на пасёлкі палопшыць сваё вясковае жыцьцё.

Цяпер наша вёска падрывае падпоры старога і пачынае будаваць новае. Адна вёска за другою імкнуцца да зямляўпарадкаваньня. Вёска Навасёлкі ў 1927 г. вышла на пасёлкі. Гледзячы на яе, зямляўпарадкуецца і в. Дайнава ў 184 двары, якая разьбіваецца на 18 пасёлкаў плошчаю ў 1.893 гэктары. Хоць замежнікі рабілі перашкоды, каб не праводзіць зямляўпарадкаваньня, але правяліся. Абрэзана ў іх 9.827 гэктараў зямлі, якою надзелена беднота. Зямляўпарадкаваньне в. Дайнава ўжо канчаецца.

Селькор Р. ДРОЗД.

Партыйная хроніка

У Фрунзаўскім райкоме КП(б)Б

РАБОЧЫ—НАМЕСЬНІК ДЫРЭКТАРА ЗАВОДУ «КАМУНАР».

Фрунзаўскі райком КП(б)Б вылучыў на пасаду намесьніка дырэктара заводу «Камунар» рабочага заводу **т. Сарокіна.** Тав. Сарокін—актыўны рабочы, член партыі, у апошні час працаваў стры

СЯУБА ІДЗЕ ПОУНЫМ ХОДАМ

З ЧЫМ БАБРУЙШЧЫНА УСТУПІЛА У ПАСЕУН. КАМПАНІЮ

БАБРУЙСК. (Наш кар.). У большасьці раёнаў акругі сяўба ўжо пачалася. Некаторыя вясковыя арганізацыі ў сувязі з пачаткам сяўбы арганізавалі сьвята першай баразны, якое адзначалі дапамогай беднаце. Так, мэліярацыйнае таварыства «Кастрычнік» у дзень сьвята першай баразны, якое супала з першым днём вялікадня, арганізаваным парадкам з чырвоным сьцягам выехала з трактарам на працу ў поле. Як-жа Бабруйшчына падрыхтавалася да пасеўнай кампаніі. Насеньнем аўсу і ячменю акруга задаволена. Адчуваецца недахват у насеньні канюшыны, лубіну, сэрадэлі, кармавых буракоў, турнэпсу. Значная колькасьць насеньня мясцовых заготовак дрэннай усхожасьці. У гэтым галоўным чынам віна падае на мясцовыя заготоўчыя арганізацыі. Так, у Клічаўскім крэдытным таварыстве з прычыны адсутнасьці памяшканьня, папсавалася 100 пуд. лубіну. Акрсельсаюзам замарожана на сваіх складах (з прычыны недагляду) 16 вагонаў насеньня аўсу, вызначаных для адгрузкі ў Полацку і Віцебску. Гэтае насеньне папсавалася і ня можа быць скарыстана для пасеву. Такім чынам, акрсельсаюз дагэтуль яшчэ ня выканаў вызначаны нарад на адгрузку ячменю ў колькасьці 30 вагонаў у Полацкую і Віцебскую акругі. Справа з здавальненьнем акругі штучным угнаеньнем абстаіць дрэнна. Калійнае ўгнаеньне часткова заменіць попел, якога ўжо загатоўлена 267 тон. А такое ўгнаеньне, як торф і вапна, ад якіх у свой час многа гаварылася, яшчэ не здабываецца і ня ўжываецца. Машынамі насельніцтва Бабруйшчыны забясьпечана больш-менш здавальняюча. Аднак, ёсьць недахват трактарных і запасных частках. За апошні час у працы па арганізацыі майстэрань адчуваецца эрух. Майстэрні ўжо прыступілі да працы за выключэньнем некаторых, якія арганізаваны па лініі селькомаў. Па вестках на 15 красавіка па акрузе ачышчэньне насеньня складае 83 проц. заданьня. Праца па ачыстцы насеньня энэргічна працягваецца. Увага насельніцтва да веснавой пасеўнай кампаніі ўзьнята ў належнай ступені. З выбарамі аграўпоўнаважаных па правядзеньні аграмінімуму Бабруйшчына крыху спазьнілася.

Ч.

Чыгуначнікі робяць вялікую справу у вёсцы

На ст. Міхановічы Зах. чыг. з красавіка месяца працуе вагон-майстэрня па рамонце с.-г. інвэнтару бяднейшага сялянства вакольных вёсак. Два рабочыя—каваль Шылак В. і сьлесар Варэнік С., ездаючы ўсе свае сілы, працуюць цэлы дзень. За гэты час імі зроблены 8 новых барон, якія разданы самым бедным сялянам, зроблены капітальны рамонт 35-ці плугоў; дробны рамонт 65 плугоў, адрамантавана 100 штук барон і шмат чаго іншага.

Трэба адзначыць, што чыгуначнікі вельмі ўдала і практычна падышлі да справы ўдзелу ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і гэта ўзварушыла вёску. Зразумела, што беднята вельмі здаволена гэтым мерапрыемствам, кулаку-ж гэта прышлося не па душы. Так, напрыклад, міханаўскі каваль Фаміч і некаторыя кулакі стараюцца ўсімі сіламі зрываць гэту работу, ганьбячы работу вагона-майстэрні, і пашыраюць розныя недарэчныя чуткі, як: «той, каму рамантуюць інвэнтар у вагоне, будзе ў наступным годзе плаціць падвойны падатак» і г. д. Але сяляне іх ужо ведаюць добра і аб усякай правакацыі кулакоў самі расказваюць у вагоне-майстэрні.

Кожны дзень да вагона зьбіраецца з розных вёсак шмат людзей, якім у чыгуначным чырвоным кутку аграном дае парады, як палепшыць сваю гаспадарку, якія мерапрыемствы трэба ўжыць, каб падняць ураджайнасьць і г. д.

А. ДЗЯМІДОВІЧ.

План павышэньня ўраджайнасьці будзе выкананы

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта)

Па Аршанскай акрузе ў кожнай вёсцы праведзены сходы, на якіх абгаворваліся пытаньні па павышэньні ўраджайнасьці, па новым с.-г падатку і па тых агранамічных мерапрыемствах (аграмінімум), якія можа правесьці ў жыцьцё кожная гаспадарка. На ўсіх сходах сяляне ўхвалялі пастановы аб правядзеньні аграмінімуму і абіралі аграўпаўнаважаных.

Цяпер мяркуецца склікаць раённыя нарады ўсіх аграўпоўнаважаных, каб з імі дэтальна абгаварыць мэтады правядзеньня аграмінімуму.

Акруговы зьезд саветаў, абгаворваючы пытаньне аб павышэньні ўраджайнасьці, у сваёй рэзалюцыі сказаў, што на працягу бліжэйшых пяці год пасеўная плошча па акрузе павінна быць павышана на 15 проц., а ўраджайнасьць павышана на 45 проц.

Тыя выступленьні на зьезьдзе па пытаньні павышэньня ўраджайнасьці, якія былі з боку актыўнага перадавога сялянства—удзельнікаў зьезду, гавораць за тое, што гэта рэзалюцыя зьезду будзе праведзена ў жыцьцё.

А. МІЛАШЭЎСКІ.

Суботнік у дапамогу калгасу

(МАЗЫР)

5-га мая, у першы дзень вялікадня, Петрыкаўская гарадзкая партыйная і камсамольская арганізацыі, разам з некаторымі беспартыйнымі членамі саюзаў арганізавалі суботнік у дапамогу буйному калгасу, які зараз арганізуецца.

За дзень работы былі раскарчаваны і рашчышчаны 3 гэктары дубняку, гэту плошчу можна будзе скарыстаць для пахаці. У суботніку прымалі ўдзел і некаторыя сяляне, якія падалі заявы аб уступленьні ў гэты калгас.

Б. Ш.

ВЕСНАВАЯ СЯЎБА РАЗГОРТВАЕЦЦА

ГОМЕЛЬ (наш кар). Паводле атрыманых вестак у Лоеўскім, Камарынскім і Брагінскім раёнах пасеў аўсу і ячменю канчаецца. У іншых раёнах веснавая сяўба таксама разгортваецца пасьпяхова.

МЕНСК

Курсы па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы

1-га чэрвеня ў Менску пры Беларускай вайсковай школе адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы курсантаў у вайсковыя школы. Усе 100 месц разьмяркованы па акругах. Праезд з акруг па чыгунцы да Менску—бясплатны. Згодна пастановы ўраду, за рабочымі, якія паступаюць на курсы, захоўваецца ўтрыманьне ад прадпрыемства нараўне з прызываемымі на тэрыторыяльныя зборы тэр-армейцамі. ЦСПСБ запрапанаваў прафарганізацыям прыняць рад мер да своячасовага падбору і накіраваньня ў Менск рабочых курсантаў.

Першы ў СССР мэдычны палітэхнікум

З новага навучальнага году аб'ядноўваюцца ў адзіны мэдычны палітэхнікум Беларусі Магілеўскі фармацэўтычны і акушорскі тэхнікумы. Палітэхнікум будзе мець два аддзяленьні: фармацэўтычны і акушэрскі. Мэдычны палітэхнікум будзе першым ва ўсім Саюзе.

400 тыс. руб. на ўпарадкаваньне мястэчак

Белсельбанк адпусьціў 400 тысяч р. крэдытаў на ўпарадкаваньне мястэчак БССР. Гэтыя сродкі будуць выкарыстаны, галоўным чынам, на арганізацыю новых калгасаў. Пэміж акругамі сродкі разьмеркаваны наступным чынам. Гомелю адпускаецца 115 тыс. р., Магілеву—42 тыс., Менску—96 т., Бабруйску—78 т., Мазыру—35 т., Віцебску—8 т. і Полацку—25 тыс.

195 тысяч рублёў на пабудову мяса-бэконнага камбінату

Белсельбанк перавёў Аршанскаму акрсельбанку 195 т. р. на дадатковае крэдытаваньне пабудовы мяса-бэконнага камбінату ў Воршы.

Прышчэпкі супроць воспы

З 15-га мая ва ўсіх амбуляторыях, дзіячай клініцы, кансультацыі пачнецца прышчэпачная кампанія супроць воспы. Прышчэпкі робяцца бясплатна.

Дапамога па часовай непрацаздольнасьці

Дапамога па часовай непрацаздольнасьці асобам, што ляніруюцца на санаторна-курортнае лячэньне Менакрстрахкасай, выплачваецца перад ад'ездам на лячэньне толькі ў размеры $^2/_3$ належнае сумы, а астатняя $^1/_3$ сумы выплачваецца пасьля звароту з курорту.

Дапамога на кармленьне дзіцяці ў далейшым будзе выплачвацца за кожныя два месяцы зразу ў канцы другога месяца.

****

Ад бюро расьсьледваньняў рэд. „Зьвязды"

У № 52 «Зьвязды» была зьмешчана заметка пра тав. Кэсьцера Ж., упоўнаважанага прамбанку. Рэдакцыя і адпаведныя кампэтэнтныя органы зрабілі расьсьледаваньне і знайшлі няправільнасьць і памылковасьць высунутых супроць тав. Кэсьцера абвінавачваньняў. Рэдакцыя шкадуе, што дала месца няправільным весткам.

Бюро расьсьледваньняў.

Кнігі для рэцэнзіі

Белдзяржвыдавецтвам прысланы ў рэдакцыю «Зьвязды» для рэцэнзіі наступныя кнігі:

А. Гурло—„Межа", зборнік выбраных вершаў.

К. Бялевіч, П. Капаевіч, Ф. Сьцяпановіч—«Новае жыцьцё», чытанка для школ малапісьменных 2-ое вып.

Я. Янаўлеў—«Барацьба за ўраджай».

Агранам М. Уліцін—«За ўраджай».

Праф. Е. Алексеў—«Лубінавае ўгнаеньне на Беларусі».

М. Савіцкі—«Галоўныя вынікі работы раённых с.-г. дасьледчых станцый БССР у галіне рольніцтва».

Ю. Рэго—„Ці можа перарадзіцца збожжа".

Е. Гур'янаў, Н. Жынкін, А. Сьмірноў, М. Сакалоў, П. Шаварoў—«Школьныя тэсты», матар'ялы для дасьледваньня школьных посьпехаў.

Б. Фартунатаў—«Як жукі ў футбол гуляюць».

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ТЭАТР[1]

(Пра БДВТ)

Гісторыя стварэньня Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага тэатру адносіцца да 1921 году, хаця некаторыя сьцьвярджаюць нібы пачатак яго пакладзены яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы, але гэта сьцьвярджаньне зьяўляецца штучным.

На працягу першага пяцігодзьдзя з 1921 па 1925 год, з невялічкага драмгуртка, заснаванага У. Я. Галубком утварыўся вандроўны тэатр, які вылукрышталізаваўся ў поўную тэатральную адзінку. З канца 1925 году гэты тэатр пачаў атрымліваць невялічкую дзяржаўную дапамогу і, ня гледзячы на цяжкія матар'яльныя ўмовы, вырас.

Такім чынам, БДВТ узгадаваны Кастрычнікам і росквіт яго, як і ўсяго беларускага тэатральнага мастацтва, магчымы толькі ва ўмовах Савецкай Беларусі.

На чале гэтага тэатральнага калектыву і па сёнешні дзень стаіць яго арганізатар і кіраўнік У. Я. Галубок, якому ўрадам БССР надана годнасьць першага народнага артысты рэспублікі.

Гэты тэатр зьяўляецца масавым народным тэатрам і карыстаецца вялізарнай папулярнасьцю асабліва сярод сялянства. Аб гэтым сьведчаць шматлікія водазывы глядачоў.

БДВТ абслугоўвае самыя цёмныя куткі БССР, гарадзкія акраіны і мястэчкі, зьяўляецца сейбітам беларускай культуры і можа быць скарыстаны, як магутны сродак палітыкі партыі ў галіне культурнага будаўніцтва вёскі.

Сваё асноўнае прызначэньне—абслугоўваць тэатральным мастацтвам беларускую вёску—тэатр цалкам апраўдвае. Вандроўчы амаль увесь час па акругах і раёнах, калектыў гэты ня лічыцца ні з якімі перашкодамі, якія сустракаюцца на яго шляху, ні з цяжкімі, іншы раз амаль немажлівымі, умовамі працы. Дабраўшыся (вельмі часта пехатою) да якога-небудзь пункту, мядзьведжага кутка, адлеглага на сотні кілёмэтраў ад чыгункі, калектыў гатоў даваць паказ дзе хочаш і калі хочаш: у хаце, у гумне, а то нават на вольным паветры, абы быў глядач, а яго, як кажуць, хоць адбаўляй, хапае.

Маючы непасрэдныя і да таго-ж вельмі цесныя суадносіны з самымі шырокімі гушчамі працоўных, БДВТ разгортвае вельмі шырокую і інтэнсыўную працу. Колькасьць паказаў, таксама як і кола мясцовасьцяй, што абслугоўваюцца ім, праяўляе тэндэнцыю да павялічэньня. Аб гэтым выразна сьведчаць наступныя лічбы: у 1921 г. было дана 42 спэктаклі; у 1922—225, у 1923—253 і г. д. (За апошнія 4 гады наладжана 892 пастаноўкі, а ў сярэднім у год—223).

Але поруч з радам бясспрэчна станоўчых бакоў, БДВТ мае многа недахопаў, адмоўных бакоў, выпраўіць якія вельмі патрэбна, бо бяз гэтага тэатр ня здолее расьці

Галоўным недахопам БДВТ зьяўляецца адсутнасьць драматургічных сіл, якія-б дапамагалі тэатру. Яшчэ і да гэтага часу ўвесь рэпэртуар тэатру (за выключэньнем 3-4 п'ес) складаецца з твораў У. Я. Галубка, якія па пераважнасьці напісаны некалькі год таму назад і зараз толькі пераапрацоўваюцца аўтарам, але з тае прычыны, што У. Я. Галубок вельмі перагружаны іншай працай, гэта пераапрацоўка робіцца на скорую руку, што адбіваецца на якасьці гэтых п'ес. Усё-ж, калі, скажам, узяць паасобныя абразкі, ну хоць-бы з п'есы «Пінская Мадонна», дык відаць, што У. Я. Галубок можа пісаць і, трэба сказаць, лепш за ўсё яму ўдаецца бытавая камэдыя. Гэта п'еса насычана чыста народным, здаровым, хоць часамі можа валіцца грубаватым гумарам. Ня гледзячы на ряд сцэнічных недахопаў, вымест гэтае п'есы цалкам даходзіць да глядача і з ідэалёгічнага боку яна шмат каштоўней за другія псэўда-рэвалюцыйныя пастаноўкі, як «Васіль Хмель» ды іншыя.

П'еса «Васіль Хмель» можа быць добрым прыкладам, як ня трэба сьляпіцца пры пераапрацоўцы п'ес. Наіўная пабудова інтрыгі. Каханьне, жаласьлівыя «перажываньні», «шалёная» зайздрасьць дэманічнай цыганкі—ўсё гэта займае ў п'есе галоўнае месца. Таму сьмешнымі здаюцца на гэтым фоне многазначныя размовы аб якойсьці «машыне» і аб надпольнай працы гэтага рэзанэрствуючага каханка і рэвалюцыянэра Васіля Хмеля.

Гэты прыклад з п'есаю «Васіль Хмель» пераконвае нас у неабходнасьці стварэньня У. Я. Галубку такіх умоў, пры якіх-бы ён усе свае драматургічныя здольнасьці накіраваў не на пераапрацоўку старога рэпэртуару, а на стварэньне новага, з **сучаснага жыцьця**. А рэпэртуар нам патрэбен такі, які-б дапамагаў сацыялістычнай перабудове вёскі, які-б меў **сацыяльна-палітычнае значэньне**, які-б адказваў на сёнешні дзень.

Другім буйным недахопам БДВТ зьяўляецца адсутнасьць правільнага мастацкага кіраўніцтва.

За апошні час з боку большай часткі актораў БДВТ наглядаецца вялікае імкненьне да вучобы, гэта бязумоўна зьяўляецца дадатным зьявішчам, і калі гэта жаданьне застанецца і надалей, дык і магчымасьці будуць для таго, каб аўладаць тэатральнаю культураю, бо бяз гэтага ня здолее расьці як актор, так і тэатр.

Зараз перад БДВТ стаіць вострa пытаньне падбору і стварэньня новага рэпэртуару. За гэтыя гады вёска так падняслася ў сваім культурным разьвіцьці, што цяперашні рэпэртуар БДВТ ня можа яе задаволіць. Пастаноўка «Кастуся Каліноўскага», якую зараз рыхтуе тэатр—ня выхад з рэпэртуарнага крызісу тэатру.

Выходзячы з усяго гэтага, нам здаецца, што зараз неабходна завастрыць увагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці навакол працы гэтага тэатру, уплываць на яго працу, дапамагаць яму ў падборы рэпэртуару. Толькі пры гэтых умовах тэатр здолее расьці.

Якія-ж задачы стаяць перад самім тэатрам?

1. Перагледзець увесь існуючы рэпэртуар тэатру з тым, каб частку з яго пераапрацаваць, другую-ж частку замяніць новымі п'есамі, якія-б завастралі ўвагу глядача на чарговых задачах партыі ў вёсцы.

2. БДВТ скарыстаць прабываньне ў Менску з тым, каб на будучы тэасэзон выехаць у падарожжа з абноўленым рэпэртуарам.

3. БДВТ праз мастацкі савет і рэпэртуарную камісію згрупаваць навакол сябе рабочага глядача, які-б уплываў на падбор рэпэртуару.

Усё гэта можна выканаць толькі пры паяўнасьці поўнага як мастацкага, так і ідэалёгічнага кіраўніцтва з боку Галоў-мастацтва, а таксама і матар'яльнага падтрыманьня.

Ад У. Я. Галубка мы патрабуем новых п'ес, якія-б адбівалі пафас сацыялістычнага будаўніцтва, арганізоўвалі начуцьці вясковага глядача, дапамагалі-б перабудове вёскі на новых сацыялістычных пачатках.

І. Г.

*) У парадку абгаварэньня.

Пуск новай швэйнай фабрыкі ў Менску

1-га чэрвеня ў Менску адбудзецца пуск новай швэйнай фабрыкі. У сучасны момант канчаецца работа па падрыхтоўцы пераходу рабочых Меншвэю на новую фабрыку.

Новая фабрыка разьлічана на выраб выключна жаночага верхняга адзеньня; паліто звычайнага фасону з танных матар'ялаў і паліто з дарагой тканіны.

Вытворчы плян працэсаў работы пабудаваны так, каб пераход ад аднаго фасону да другога і ад аднаго сэзону да другога не адбіўся на агульным ходзе работы. Фабрыка будзе выпушчаць штодзённа 1.320 паліто.

З разгортваньнем работы фабрыка пярэйдзе на дзьве зьмены, у якіх будзе занята 890 чыста вытворчых рабочых, а разам з дапаможным пэрсаналам 1.035.

Прэзыдыум ЦП саюзу швэйнікаў зьвярнуўся да Біржы Працы з прапановай прадставіць адміністрацыі Меншвэю канчатковыя весткі аб наяўнасьці на Біржы патрэбных для фабрыкі рабочых.

Улічваючы ніязначную колькасьць кваліфікаванай сілы сярод беспрацоўных, што знаходзяцца ў Менску, прэзыдыум ЦП паведаміў акруговым праўленьням саюзу, што беспрацоўныя, кваліфікаваныя рабочыя-швэйнікі гэтых округ могуць быць прыняты на фабрыку. Пры чым з боку ЦП ня будуць прадстаўлены ніякія гарантыі ў сэнсе забесьпячэньня кватэрамі і г. д.

На фабрыку будзе прынята да 400 новых рабочых. Саюз швэйнікаў прызнаў патрэбным пры паступленьні іх на работу заключыць спэцыяльную згоду ў дадатак да калектыўнага дагавору аб умовах іх працы на першы час, бо гэтыя рабочыя ў масе сваёй незнаёмы будуць з фабрычнымі ўмовамі работы.

Прэзыдыум ЦП запрапанаваў адміністрацыі Меншвэю паскорыць распрацоўку пытаньня аб пераходзе новай фабрыкі на 7-гадзінны рабочы дзень.

Цэрабкоп мясам забясьпечаны

Напружаньне на мясным рынку, якое наглядалася ў пачатку 3-га кварталу, у сучасны момант зьменшылася. Мяса ў крамах Менскага ЦРК досыць. Чаргі не наглядаецца. Белмясгандаль атрымаў выстарчальную колькасьць жывёлы для поўнага здаваленьня попыту на мяса. Усё гэта забясьпечвае бесперабойнае здаваленьне патрэб гарадзкога насельніцтва мясам на бліжэйшы час.

Акрамя таго, Наркамгандаль СССР павялічыў нарад па заводзе украінскае жывёлы ў БССР на трэці квартал да 1500 тон. Наркамгандаль УССР заказ па гэтым нарадзе ўжо выконвае.

Дэкадныя весткі аб мясовых загатоўках сьведчаць аб здавальняючым выкананьні загатоўчага пляну.

Белдзяржгандаль ставіць у бліжэйшы час для выпасу да 2000 штук буйнае рагатае жывёлы.

Дзякуючы гэтаму будзе павышана якасьць мясапрадуктаў мясцовых загатовак.

Пабудуем самалёт і танк

ПА ВЫКЛІКУ РЭДКАЛЕГІІ МЕНАКРЗА

Рэдкалегія Павукова-Дасьлед. інст. імя Леніна ад імя рабкораў і чытачоў уносіць 31 руб.

Збор ароднаў працягваецца

***

ПА ВЫКЛІКУ «НКФІНАЎЦА»

Рэдкалегія насьценгазэты інвалідзкай каапэрацыі (Менск) ад імя рабкораў і чытачоў уносіць 72 р. 75 к.

Збор ароднаў працягваецца.

Выклікаем насьценгазэту Белсампрамсаюзу.

Усебеларускія фізкультурныя спаборніцтвы

Учора ў Менску пачаліся ўсебеларускія міжвузаўскія фізкультурныя спаборніцтвы. Гэтым у Менску адкрыўся сэзон па футболе і матчы. У спаборніцтве ўдзельнічалі каманды Беларускай с.-г. акадэміі і БДУ. Ня гледзячы на стомленасьць у дарозе горацкая каманда бліскуча разьбіла унівэрсытэцкую з рахункам 7:4. Каманда акадэміі атрымала таксама перамогу і па волейболу. Будзе яшчэ спатканьне на баскетболу. Усяго ў спаборніцтве ўдзельнічае 6 каманд.

Сталоўкі для сэзоньнікаў

Прэзыдыум ЦП саюзу нархарч прызнаў патрэбным, каб каапэрацыя бэзадкладна прыступіла да арганізацыі сталовак для сэзоньнікаў. Намячаецца адкрыцьцё 3-х сталовак у лягэрах, на торфараспрацоўках і агульная сталоўка для сэзоньнікаў-будаўнікоў Менску. Адначасова будуць пашыраны сталоўкі на пабудове Унівэрсытэцкага гарадку і на заводзе «Энэргія». ЦРК запрапанавана прыстасаваць для абслугоўваньня сэзоньнікаў усе сталоўкі гораду і арганізаваць на буйных пабудовах ларкі і буфэты.

Чым тлумачыцца

5 мая па асушаным Мар'інскім балоце распачаліся сельска-гаспадарчыя работы, працавала першая на Беларусі трактарная калёна. Былі закладзены асновы першай у Савецкім Саюзе гіганцкай савецкай гаспадаркі на балоце. Прысутнічалі пры гэтым прадстаўнікі грамадзкіх арганізацый, карэспандэнты газэт і сотні сялян вакольных вёсак.

Ня прыходзіцца гаварыць аб выключным значэньні гэтага факту. Будаўніцтва хлебнай фабрыкі, трактарныя калёны на былым балоце—якіх ўдзячны, якіх патрэбны матар'ял для кіно-плёнкі!

І вось, ня гледзячы на свае абяцанкі, Белдзяржкіно не паклапацілася прыслаць у саўгас свайго чалавека.

Напярэдадні тав. **Матусаву** (нам. загадчыка Белдзяржкіно) званілі з Белсельтрэсту і прасілі выехаць у Мар'іна, таварыш Матусаў прынцыпова не супярэчыў, калі ня лічыць таго, што ён заклапочана распытваў—«ці накормяць хаця ў гэтым саўгасе нашага чалавека». Сумненьні тав. Матусава былі «разьвязаны»—накармяць абяцалі самым лепшым чынам! Аднак, кіно-апаратар усё-ж такі ня быў пасланы.

Зразумела, што мы ня можам дакладна вызначыць, як павінна будавацца Белдзяржкінаўская кіно-хроніка. Аднак, мы ўсё-ж такі лічым, што паказаць працоўным Беларусі на экране будаўніцтва хлебнае фабрыкі, трактарную калёну на былым балоце было-б карысьней усякіх «краявідаў»: менскіх шыльдаў, разьліву Сьвіслачы, «бурных марэй», «горных хрыбтоў»

Міхась Гольдбэрг. Ясь Шкадарэвіч

На Біржы працы

Пачынаецца набор на курсы каменьшчынаў-аладчыкаў і тынкаўшчыкаў ЦПТ'у. Прыём заяў ад беспрацоўных праводзіцца наступным парадкам:

Ад членаў саюзу—па саюзах, ад членаў саюзу—на будаўнічай сэкцыі біржы працы. У сувязі з разгортваньнем будаўнічага сэзону, залічаныя на будаўнічы цэх будуць пасылацца на грамадзкія работы.

З 14 па 18 мая штодзённа з 1 да 3 гадзіны дня ў сэкцыі прац. мастацтва пры біржы працы перарэгістрацыя і рэгістрацыя мастакоў усіх спэцыяльнасьцей, незалежна ў якім саюзе (прафэсіянальным) яны лічацца.

Пры перарэгістрацыі патрабуюцца наступныя дакументы: членскі прафсаюзны білет, ці даведка аб працы па найме за 1928 год.

Тыя, што ня зьявяцца на перарэгістрацыю, будуць зьняты з вучоту біржы.

Паведамленьні

— МАБК просіць зьявіцца на пасяджэньне партгрупкі, якое адбудзецца 13-V, а 6 з пал. гадз. увеч., у памяшканьні малай залі клюбу К. Маркса (ул. Энгельса), наступных таварышоў: Грабоўскага Л. А.—яч. службы шляху пасажырск., Харчэнка І. С.—яч. БСІКО, Масіна М. М.—яч. Белкаапсаюзу, Клеймана С. Я.—яч. шчацінай фабр., Кузьнядова І. З.—яч. УМТ'у Гушча Л. А.—яч. БДУ, Кухрашова—яч. хаўбасной фабр., Пракоф'ева І. М.—яч. шклоаводу, Барушка А. Д.—яч. службы шляху, Кагана С. С.—яч. Белжыльсаюзу, Арцюха Я. В.—Кастрычнік. РК, Гальмінскага М. І.—яч. службы шляху таварнай, Скарабагатага А. П.—яч. МЦРК, Эйсманда—яч. службы эксплёатацыі пасажырск., Васільева Н. І.—яч. дэло МБВ ч., Станілевіча—яч. войлачнай фабр., Парахневіч Г. І.—яч. рабфаку.

Просьба ўсіх таварышоў, а таксама сакратароў тых ячэек КП(б)Б, таварышы якіх выклікаюцца на пасяджэньне партгрупкі, зьявіцца абавязкова і без спазьненьня.

— Падгабінет. 13 мая, а 7 г. ув.—сход сэкцыі антырэлігійнага выхаваньня.

Парадак дня:

Антырэлігійныя моманты. У праграмах І-га канцэнтру.

Яўка сяброў сэкцыі абавязкова. Запрашаецца настаўніцтва.

— У панядзелак, 13 мая, а 7 г. ув.—пасяджэньне акруговае метадычнае камісіі.

Парадак дня:

Вынікі падзалёгічнага абсьледваньня І. груп сямёхгодак, 2. Менску (дакл. т. Пікулік).

Яўка сяброў камісіі абавязкова. Запрашаюцца сябры падзалёгічнае асацыяцыі і настаўніцтва.

— 12 мая, а 12 г. дня, у памяшканьні Фрунзаўскага райкому КП(б)Б, склікаецца нарада ўсіх шэфтаварыстваў Фрунзаўскага району.

Парадак дня: Аб асеньняй кампаніі, аб прыцягненьні адпускнікоў да працы на вёсцы, арганізац. пытаньні, бягучыя справы.

Яўка ўсіх старшынь і жэн. сэкцый абавязкова.

— КЛЮБ ІМЯ КАРЛА МАРКСА. Сёньня—кіно. Пачатак а 8 і 10 гадз. увечары. Выклікаецца 2-я група дружыны парадку.

А 7 гадз.—занаткі струннага аркестру ў аўторак 14 мая, а 8 гадз. увеч. заняткі драмгуртку. Яўка без спазьненьня.

— ДОМ АСЬВЕТЫ.—У панядзелак 13-V—а 7-й гадз. увечары адбудзецца сход беспрацоўных сяброў Саюзу Працасьветы—пайшчыкаў МЦРК. Яўка абавязкова.

ВАЙСКОВЫ ГАБІНЭТ БДУ. 12-га мая а 9 гадзіне раніцы у летнім ціры Дому Чырвонай армії прызначаюцца стралковыя спаборніцтвы Беларускіх Вузаў; праводзімых ЦБ пралетстуду. На спаборніцтва павінны зьявіцца ніжэй пералічаныя студэнты.

1. Самахвалаў Л. С., 2. Позьняк П. М., 3. Бэброў С. Н., 4. Коўшык М. Л., 5. Сімаенка Ф. А., 6. Глушак Л. С., 7. Вораб'ёў В. Я., 8. Сурога В. І., 9. Бялькевіч А. К., 10. Касьцюкевіч Ф. Н., 11. Котаў.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

У ПАНЯДЗЕЛАК, 13-га мая, а 7 гадз. 30 мін. увечары, у ДОМЕ СЕЛЯНІНА, 1-ы паверх, у залі СПЭЦЫЯЛІСТЫХ
—СКЛІКАЕЦЦА—
АГУЛЬНЫ СХОД ІТР
З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
1. Даклад аб IV-ым Усесаюзным зьезьдзе ІТР.
2. Даклад аб Усебеларускай канфэрэнцыі ІТР.
Запрашаюцца члены Бюро ІТС і ўсе інж.-тэх. работнікі гор. Менску.
Прэзыдыум Бел. МВІТ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Нядзеля, 12 мая
РАНІШНІК. Для 20-й школы
СТРАЛОК ТЭЛЬ
Пачатак а 12-й гадз. дня.
УВЕЧАРЫ Для начскладу Чырвонай арміі
КАР'ЕРА „таварыша" БРЫЗГАЛІНА
Прызначаны на сёньня спэктакль «Запяюць верацёны» ПЕРАНОСІЦЦА на нядзелю 19 мая.
Білетыу,зятыя на гэты спэктакль маюць сілу на19-V.
Астача білетаў у касе тэатру.

„Кіно „СПАРТАК" Яд панядзелка, 13 мая
амэрыканскі трука-прыключэнскі фільм
ЗАГАДКАВЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ у Амэрыцы
(Дэдэктыў Сьцюарт ВЭБС)
у 2-х эпізодах—12 част.
2 эпізоды—12 частак у адзін сэанс.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

Кіно КультурА
Скора!!! 400 міліёнаў Скора!!!
Кіно Літэрка цыянАЛ
ПРЭМ'ЕРА! ПРЭМ'ЕРА!
Мастацка-гістарычны фільм з жыцьця вучонага паэты — М. В. ЛАМАНОСАВА —
СЫН РЫБАКА кіно-аповесьць у 7 част.
Пачатак І-га сэансу а 6 гадз. 30 мін.
Кіно ПралетарЫ
З прычыны вялікага посьпеху ДРУГІ ТЫДЗЕНЬ! МЯЦЕЖ
па аповесьці Д. ФУРМАНАВА.
Скора! „ЗЬВІНІГАРА".
1-шы дзіцячы кіно-тэатр ЮНЫ ПІЯНЭР (будынак кіно „ПРАЛЕТАРЫ")
АД АЎТОРКА, 7 МАЯ
СТЭНЛЕЙ У ГЛЫБІ АФРЫКІ
3-я серыя ў 7 частках.
Пачат. 1-га сэансу а 3 гадз. дня.
Кіно СпартаК
З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ гастролі Т. СТРУКАВАЙ працягнуты
На экране вынесці баевік
ШТУРМАН з ПРЫБОЮ
Драма ў 8 част.
У галоўн. ролі ПАЎЛЬ ВЭГЕНЭР

СКОРА АДКРЫВАЕЦЦА
Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71

Праўленьне Маскоўска-Беларуска-Балтыйскай чыгункі
даводзіць да ведама, што з 15 мая г. г.
СКОРЫЯ ЦЯГНІКІ №№ 11 і 12 (б. 7 і 8) ЗНОСІН МАСКВА-МЕНСК
будуць знаходзіцца ў звароце 4 разы ў тыдзень:
Цягнік № 12: адпраўленьне з Менску—19 г. 45 м. (па нядзелях, аўтор., серадах і пятніцах) прыбыцьцё ў Маскву—9 г. 10 м. (па панядз., серадах, чацьвяргох і суботах)
Цягнік № 11: адпраўленьне з Менску—22 г. 05 м. (па панядз., аўторках, чацьвяргох і суботах). прыбыцьцё ў Менск—11 г. 35 м. (па нядзелях, аўторках, серадах і пятніцах).
Праўленьне МБВ чыг.

АБВЕСТКА
На падставе інструкцыі Саюзнага Савету Сацстраху пры НКПрацы СССР ад 31 студзеня 29 г., абвешчанай у газэце «Труд» ад 24 лютага 29 г.
МЕНАКРСТРАХКАСА абвяшчае ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЮ ЎСІХ СТРАХАВАЦЕЛЯЎ
МЕНСКАЙ АКРУГІ (АКРАМЯ Г. БАРЫСАВА)
Парарэгістрацыі падлягаюць усе ўстановы, прадпрыемствы, гаспадаркі, арцелі і прыватныя асобы, што карыстаюцца наймовай працай, акрамя асоб, што карыстаюцца працай хатніх работніц.
ТЭРМІН перарэгістрацыі ўстанаўляецца з 10—20 МАЯ г. г., для чаго ўсе памянёныя страхавацелі, што знаходзяцца ў г. Менску, павінны зьявіцца ў памяшканьне страхкасы, а страхавацелі раёнаў—да райупаўнаважанага па сацстраху за атрыманьнем бланкаў-заяў аб рэгістрацыі.
Вінаватыя ва ўхіленьні ад перарэгістрацыі будуць прыцягнуты да адказнасьці.
Старшыня Менакрстрахкасы МІРУЦ
Ст. бухгальтар СЛОЎШЧАР

ЗЬВІНІГАРА
Пралітыя крывёю, Таямніцай запячатаныя, Аковыя легэндамі... Вякамі!... Лямаць у зямлі украінскай Пахавальныя скарбы нацыянальнага багацьця краіны...
ГЭТЫМІ ДНЯМІ!
Рэжысэр А. ДОЎЖАНКА
Апэратар Б. Завелеў
Мастак праф. В. Крычаўскі
У гал. ролях: Падарожны, Свашчэнка, Отаева, Падзешскі, Селюк.

Даводзіцца да ведама, што 22-га красавіка г. г. у г. Менску АРГАНІЗАВАЛАСЯ ПРАМЫСЛОВА-каапэрац. арцель кавалёў „МЭТАЛІСТЫ"
Арцелью прымаюцца заказы на навальскія вырабы, а таксама прадаюцца сялянскія калёсы
АДРАС: 2-я Стара-Віленская вул. № 24 (Перасьпенскі раён).

РЭСП. БЮРО ОРУ
У АЎТОРАК, 14 МАЯ а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні БЕЛПАЙГАНДЛЮ вытворча-прамысловай сэкцыяй ОРУ
скліканецца
АГУЛЬНЫ СХОД ЧЛЕНАЎ ОРУ
усіх вытворчых і прамысловых прадпрыемстваў г. Менску
ПАРАДАК ДНЯ:
Вучот і справаздачнасьць у саўгасах Белсельтрэсту і мэтады калькуляцыі прадукцыі вытворчасьці сельсгаспадарні.
Дакладчык гал. бух. БСТ тав. Сарагавец, і сэкдакладчык—ОРУ.
Запрашаюцца аграномы Белсельтрэсту, прадстаўнікі аграсэкцыі ІТР, а таксама рахункавыя і статыстычныя працаўнікі.
Просьба зьявіцца без спазьненьня.

ПРОДАЕ